Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.
Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 мая 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 89 (29458)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА




НОВАЕ Ў КРЫМІНАЛЬНЫМ КОДЭКСЕ
МС

ВЯРНУЦЦА АДТУЛЬ, АДКУЛЬ НЕ ПРЫХОДЗЯЦЬ... 19



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Марына АРЦЁМЕНКА, начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:**

*«Шчаслівая сям'я пазначана адным з прыярытэтаў развіцця ў гэтай пяцігодцы ў асноўных праграмных дакументах краіны. Па даных сацыялагічных апытанняў, 98 % насельніцтва лічаць сям'ю найважнейшай часткай жыцця. У разуменні сучаснага беларуса сям'я асацыюецца з дзецьмі, на другім месцы — каханне, на трэцім — дом. У сем'ях пражывае больш за 80 % насельніцтва Беларусі. Сем'яў з дзецьмі налічваецца 1143 тысячы. Шлюб захоўвае сваю каштоўнасць, што паказалі і даныя перапісу насельніцтва 2019 года: 62 % мужчын і 53 % жанчын знаходзяцца ў шлюбе».*

# На ўсе рукі майстар



Сямідзесяцігадовы жыхар вёскі Юзяфоўка Хоцімскага раёна Іван МАКАРАНКА, былы механізатар, і на пенсіі не любіць сядзець без справы — збірае трактары, зварвае, куе, робіць прычэпы для міні-трактароў. Нядаўна Іван Іванавіч зрабіў і пафарбаваў новы прычапны кузаў. З гэтым творам я і зрабіў партрэт «самадзельніка»: так аднавяскоўцы называюць мясцовага майстра.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

## КОРАТКА

• **Пытанні атэстацыі работнікаў аховы здароўя вынесены на грамадскае абмеркаванне.**

• Эла Сяліцкая пераабрана на пасаду старшыні Беларускай федэрацыі плавання.

• **Віцебская вобласць атрымала больш за 25 тысяч доз вакцыны «Спадарожнік V».**

• У турападобных жывёл у заказніку «Сярэдняя Прыпяць» з'явілася патомства.



ISSN 1990 — 763X

На ростанях

# БЕЛАРУСКАЯ АМАЗОНКА

## Ці стане Палессе аб'ектам сусветнай спадчыны?

**Адзін з найбуйнейшых рэгіёнаў, які захаваўся ў некранутым стане і які за разнастайнасць азёр, рэк і балот празвалі Еўрапейскай Амазонкай (ці морам Герадота), усё яшчэ застаецца невядомым шырокаму колу турыстаў. Але ў нас ёсць неблагі шанц для раскруткі рэгіёна. У межах кампаніі «Захаваем Палессе» рыхтуецца намінацыйная заяўка на прыданне Прыпяцкаму Палессю статусу аб'екта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, а таксама біясфернага рэзервата ЮНЕСКА. На дадзены момант такія статусы мае Белавежская пушча. Атрыманне сусветнага прызнання будзе садзейнічаць як захаванню ўнікальнага прыроднага комплексу, так і прыцягненню інвестыцый для стварэння інфраструктуры, турызму і наогул устойлівага развіцця рэгіёна.**

Тут пражываюць многія віды жывёл, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення, сярод якіх зубры і рысі, знаходзяць прыстанак пералётныя птушкі (у тым ліку самая рэдкая пеўчая птушка ў Еўропе — вяртлявая чаратнянка). Адна ж з найбольш унікальных прыродных разынак Палесся — Альманскія балоты, якія ў 20-х гадах мінулага стагоддзя маглі стаць першым нацыянальным паркам на тэрыторыі Беларусі і Польшчы. Дарэчы, на аснове балотных комплексаў і нацпарку ўжо сёння на нацыянальным узроўні Прыпяцкае Палессе стала прыродным рэзерватам. І менавіта гэтыя тэрыторыі плануецца далей прасоўваць як аб'ект сусветнай спадчыны.

СТАР. 4

Сумесны праект «Звязды» і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# ВОДНЫЯ, ВЯРЧАЛЬНЫЯ, ПЕРАСОВАЧНЫЯ...

## Распачынаецца сезон атракцыёнаў. Хто і як сочыць за іх станам?

**Нарматыўны тэрмін службы — дзесяць гадоў, вызначаны вытворцам, — у Беларусі адпрацавала 65 % атракцыёнаў (160 штук), а многія працуюць і звыш 30 гадоў. Аднак баяцца гэтага не трэба, бо штогод яны праходзяць тэхнічную дыягностыку, а пасля ўстаранення выяўленых дэфектаў праводзіцца тэхнічны агляд, які выконваецца пад нагрузкай, запэўніваюць эксперты. Яны расказалі і пра стан прамысловай бяспекі пры эксплуатацыі атракцыёнаў у краіне, і пра тое, як іх рыхтуюць да сезона. А таксама распавялі, якія новыя забаўкі чакаюць дзяцей і дарослых на сёлетніх канікулах.**

СТАР. 5



Фота Ірыны СІДАРОК.

З першых вуснаў

# Пішам Канстытуцыю будучыні нашай дзяржавы

**Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўнікамі Канстытуцыйнай камісіі Беларусі. Удзельнікі абмеркавалі некаторыя пытанні, якія ўзнімаюцца падчас пасяджэнняў камісіі.**

«Мы робім Канстытуцыю будучыні нашай дзяржавы. І калі мы хочам, каб дзяржава была шчырай, сумленнай і справядлівай, такая павінна быць Канстытуцыя і прыняцце яе павінна быць такім. Калі людзі падтрымаюць новы праект Канстытуцыі — быць гэтай Канстытуцыі. Не падтрымаюць — у нас жа Канстытуцыя ёсць. Але трэба зрабіць так, каб людзі падтрымалі наш праект новай Канстытуцыі. А каб падтрымалі, яна павінна адпавядаць запытам гэтых людзей», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на гэтым этапе практычна не ўмешваецца ў работу Канстытуцыйнай камісіі. «Але пры неабходнасці, калі будзе такое з вашага боку патрабаванне, для абмеркавання нейкіх канкрэтных пытанняў мы збяромся і абмяркуем», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, калі праект аднаўленай Канстытуцыі будзе падрыхтаваны, то пройдзе падрабязнае чытанне праекта з удзелам Прэзідэнта. «Збяромся і будзем чытаць — па раздзелах, па артыкулах, асабліва звяртаючы ўвагу на навацыі. Я буду выказваць свае меркаванні, вы свае выкажаце ў праекце. Органы ўлады змогуць унесці нейкія прапановы, таксама грамадзяне. Мы ўсё гэта павінны ўлічваць», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, многае ў рабоце над новай Канстытуцыяй будзе залежаць ад эліты грамадства: кіраўніцтва краіны на ўсіх узроўнях, юрыдычнай грамадскасці, адукаваных, разумных, таленавітых беларусаў, якія будуць не толькі выказваць свае меркаванні, але і весці за сабой усё грамадства.

Прэзідэнт падзякаваў грамадзянам, якія актыўна накіроўваюць прапановы па магчымых зменах у Канстытуцыю. «Талковыя, разумныя юрысты выходзяць напрамую на старшыню Канстытуцыйнай камісіі, кіраўнікоў палат парламента і прапаноўваюць канкрэтныя змены ў праект Канстытуцыі. Словам, людзі паводзяць сябе актыўна — тыя, хто хоча захавання краіны, хто разумее, што такое Канстытуцыя», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар падкрэсліў, што нельга дапусціць, каб Канстытуцыя была няправільнай, а пэўныя змены ўносіліся «для птушачкі» ці ў папулісцкіх мэтах. «Не павінна быць, Пётр Пятровіч (старшыня Канстытуцыйнай камісіі і Канстытуцыйнага Суда Беларусі Пётр Міклашэвіч. — **«Зв.»**), так ні ў якім разе», — канстатаваў Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

**Пасля нарады з Прэзідэнтам старшыня Канстытуцыйнай камісіі Пётр МІКЛАШЭВІЧ расказаў журналістам, як ідзе работа над асноўным законам краіны.**

Так, ужо адбылося тры пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі. Падрыхтаваны тэкст змен па раздзеле аб асноўных правах і свабодах чалавека і грамадзяніна, дзе будуць зменены тэксты 14 артыкулаў. Таксама па выніках работы Канстытуцыйнай камісіі падрыхтаваны тэкст змен у раздзел па выбарчай сістэме, там змены падрыхтаваны па васьмі артыкулах гэтага раздзела. На трэцім пасяджэнні разглядалася пытанне аб магчымым пераразмеркаванні паўнамоцтваў паміж Прэзідэнтам і ўрадам. Пётр Міклашэвіч расказаў, што на найбліжэйшым пасяджэнні камісіі будзе разглядацца пытанне аб функцыях і паўнамоцтвах парламента.

«Найважнейшая задача перад Канстытуцыйнай камісіяй — знайсці аптымальны варыянт пераразмеркавання паўнамоцтваў паміж Прэзідэнтам, урадам і парламентам пры захаванні прэзідэнцкай формы кіравання. Сёння на сустрэчы з Прэзідэнтам абмяркоўваліся некаторыя аспекты гэтага пераразмеркавання на прэзідэнцкім узроўні. Пытанне стаіць аб тым, каб захавалі моцную прэзідэнцкую ўладу з аднаго боку, а з другога боку — каб павысілася актыўнасць урада і парламента», — адзначыў Пётр Міклашэвіч.

Ён падкрэсліў, што Канстытуцыя — асноўны закон краіны, сістэмны дакумент, які патрабуе ўзважанага падыходу. Таму Канстытуцыйная камісія сістэмна працуе, разглядае звароты і прапановы грамадзян. Запланавана яшчэ шэсць пасяджэнняў камісіі.

Пётр Міклашэвіч расказаў журналістам, як прымаюцца прапановы грамадзян. «Прапаноў паступае тысячы, і задача камісіі — знайсці найбольш аптымальныя, на аснове якіх магчыма ўносіць змены ў Канстытуцыю. Мы вельмі ўважліва ставімся да прапаноў грамадзян. Канстытуцыя — гэта грамадскі дагавор аб ладзе грамадства і дзяржавы, аб сістэме дзяржаўнай улады і ўзаемаадносінах асобы, грамадства і дзяржавы. І вельмі важна сёння адчуваць, бачыць і чуць грамадзян, іх пажаданні аб тым, якім павінен быць асноўны закон нашай краіны, па якім нам усім, грамадзянам Рэспублікі Беларусь, неабходна будзе далей жыць, працаваць і дзейнічаць. Канстытуцыя — гэта арыенцір на будучыню», — адзначыў старшыня Канстытуцыйнай камісіі.

# «Мы заўсёды настроены на дыялог»

## Прэзідэнт прыняў даверчыя граматы паслоў шасці краін

**Урачыстая цырымонія адбылася ў Палацы Незалежнасці. Даверчыя граматы Прэзідэнту Беларусі ўручылі паслы Расіі, Ірака, Нікарагуа, Каралеўства Саудаўская Аравія, Сьера-Леонэ, Руанды.**

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што сустрэча з пасламі праходзіць адразу пасля святкавання святой для кожнага беларуса даты — Дня Перамогі і напярэдадні 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. «Мы гэта памятаем, і ў майскія дні кожны год славім герояў, смуткуем аб шматмільённых нявінных ахвярах», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, сёння сітуацыя ў свеце далёкая ад спакойнай. Пандэмія каранавіруса абвастрыла барацьбу за геапалітычны ўплыў, перадзел сфер інтарэсаў у эканоміцы. «Мы не можам гэта ігнараваць так жа, як і вы. Не спыняюся паўтараць, што толькі сам беларускі народ мае права вырашаць, якой павінна быць яго будучыня», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў паслам пра Усебеларускі народны сход, які прайшоў у лютым. «Рашэнні гэтага прадстаўнічага форуму адназначна пацвердзілі падтрымку дзяржаўнага курсу на далейшае развіццё сацыяльнай дзяржавы з высокатэхналагічнай эканомікай. Пры гэтым народнае веча паказала таксама запыт грамадства, прынамсі яго часткі, на перамены ў грамадска-палітычным жыцці. Беларусы падтрымалі абвешчаны працэс канстытуцыйнай рэформы, які ідзе адкрыта, з шырокім абмеркаваннем. Праўда, гэта не ўсім падабаецца за мяжой», — расказаў Прэзідэнт. Але, па яго словах, нават у такіх няпростых умовах Беларусь застаецца прыхільнай канструктыўнаму ўзаемадзеянню на міжнароднай арэне. «Мы заўсёды настроены на дыялог. Але ён павінен быць паважлівым, сумленным і раўнапраўным. Вельмі спадзяюся, што вы прапануеце цікавыя ідэі для развіцця супрацоўніцтва, узбагаціце нас станоўчым вопытам сваіх краін», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да паслоў.

### АБ РАСІІ

Звяртаючыся да Яўгена Лук'янава, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расійскай Федэрацыі ў Беларусі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзве брацкія краіны звязваюць шматгадовыя і стратэгічныя адносіны. «Няма ніводнай сферы, у якой нашы краіны не мелі б цесных і трывалых сувязяў. На долю Расіі прыпадае каля паловы агульнага аб'ёму нашага знешняга гандлю. Поўным ходам ідзе дыялог па паглыбленні саюзнай інтэграцыі ў мэтах стварэння роўных умоў суб'ектам гаспадарання і больш эфектыўнага выкарыстання новых магчымасцяў супрацоўніцтва», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што Беларусь і Расія маюць рэзервы практычна на кожным кірунку. «І няхай нашы адносіны з Расійскай Федэрацыяй нікога не напружваюць. Мы не будуем нашы адносіны супраць каго б ні было. Але калі хтосьці асмеліцца кінуць нам выклік — Расіі ці Беларусі або адначасова Расіі і Беларусі — вы ведаеце, што мы адкажам», — канстатаваў беларускі лідар. Ён выказаў упэўненасць, што Беларусь і Расія і далей будуць знаходзіць узаемавыгадныя рашэнні.

### АБ ІРАКУ

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь разглядае Ірак у якасці перспектыўнага палітычнага і гандлёва-эканамічнага партнёра на Блізкім Усходзе. «Мы проста не выкарыстоўваем пакуль тыя рэзервы, што ў нас ёсць. У нашых народаў даўняя гісторыя дружалюбных сувязяў. Гатовыя развіваць узаемадзеянне ў машынабудаванні, сельскай гаспадарцы і фармацэўтыцы, а таксама ў адукацыі. Рэгулярныя авіязносіны паміж нашымі сталіцамі ствараюць спрыяльныя ўмовы для развіцця турызму, гуманітарных кантактаў і рэалізацыі сумесных бізнес-праектаў», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

### АБ НІКАРАГУА

Прэзідэнт адзначыў, што Беларусь надае вялікае значэнне пашырэнню сувязяў з краінамі Лацінскай Амерыкі, у тым ліку з даўнім саюзнікам — Нікарагуа. У апошнія гады ўзаемадзеянне паміж Мінскам і Манагуа носіць інтэнсіўны характар, асабліва ў палітычнай сферы. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што хацелася б, каб гэтая палітыка перарасла ў эканоміку.

«Мы высока цэнім падтрымку, якую ваша краіна аказвае нам на міжнародных пляцоўках. Мы ў даўгу не застанёмся, можаце на нас разлічваць», — запэўніў беларускі лідар.

### АБ КАРАЛЕЎСТВЕ САУДАЎСКАЯ АРАВІЯ

Прэзідэнт Беларусі пацвердзіў гатоўнасць у найбліжэйшы час актывізаваць двухбаковы палітычны дыялог з адным з лідараў арабскага свету — Каралеўствам Саудаўская Аравія.

«Мінск зацікаўлены ў развіцці гандлёвага супрацоўніцтва ў Эр-Рыядам. Мы шмат разоў аб гэтым казалі. Нашы краіны маюць узаемадапаўняльны характар эканомік, што робіць нас вельмі выгаднымі партнёрамі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

### АБ СЬЕРА-ЛЕОНЭ І РУАНДЗЕ

Аляксандр Лукашэнка расказаў аб гатоўнасці выбудоўваць эфектыўныя доўгатэрміновыя адносіны са Сьера-Леонэ. «Можам даць вам вялікі выбар прадукцыі, уключаючы шырокі спектр спецыяльнай тэхнікі. Прапануем удзяліць належную ўвагу супрацоўніцтву ў сельскагаспадарчай сферы: ад паставак прадукцыі да абмену вопытам вырошчвання культур і падрыхтоўкі спецыялістаў», — прапанаваў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар заўважыў значны патэнцыял для ўзаемадзеяння з Рэспублікай Руанда ў гандлі, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, адукацыі і турызме. Ён падкрэсліў, што неабходна паскорыць фарміраванне неабходнай дагаворна-прававой базы. «Можам абмеркаваць пастаўкі беларускай тэхнікі, якая ўжо добра вядомая ў большасці афрыканскіх дзяржаў і паспяхова працуе, у тым ліку ў суседніх з Руандай краінах. Бачым перспектыву для рэалізацыі сумесных праектаў па здабычы карысных выкапняў, удзелу ў інфраструктурных праектах, супрацоўніцтва ў галіне медыцыны і падрыхтоўкі кадраў», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

### «НАШЫ НАРОДЫ АБ'ЯДНОЎВАЕ ЖАДАННЕ ЖЫЦЬ У СПРАВЯДЛІВЫМ І БЯСПЕЧНЫМ СВЕЦЕ»

Прэзідэнт адзначыў, што прыезд паслоў у Мінск — пацвярджэнне таго, што ў Беларусі ёсць сябры на ўсіх кантынентах. «Нашы народы аб'ядноўвае жаданне жыць у больш справядлівым і бяспечным свеце, дзе ёсць умовы для эканамічнага росту, устойлівага развіцця і працвітання ўсіх дзяржаў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Звяртаючыся да паслоў, ён выказаў надзею, што кожны з іх узбагаціць супрацоўніцтва новымі прыкметнымі дасягненнямі і, пазнаёміўшыся з нашай краінай, палюбіць яе. «Са свайго боку хачу запэўніць, што мы адкрытыя да сумеснай працы на раўнапраўнай, узаемавыгаднай аснове ў духу сяброўства і павагі. Ад усёй душы жадаю поспехаў у вашай адказнай дыпламатычнай місіі, цікавай і плённай працы на карысць нашых краін і народаў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

**Пасля ўрачыстай цырымоніі перадачы даверчых грамат паслы расказалі журналістам, якой бачаць сваю дыпламатычную місію ў Беларусі.**

### «АКЦЭНТ — НА ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ»

«Я буду рабіць акцэнт перш за ўсё на нашай плённай, узаемавыгаднай, эфектыўнай сумеснай працы. Сёння толькі два тыдні, як я прыехаў у Мінск. Я, вядома, вельмі таленавіты чалавек, але пакуль усе файлы не прачытаў. Пакуль займаюся дамашняй работай, урокі трэба рыхтаваць старанна», — адзначыў **Яўген ЛУК'ЯНАЎ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь.**

### «НАМ ВЫГАДНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ БЕЛАРУСКУЮ ТЭХНІКУ»

Па словах **Махамеда ЯНГАВА, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Сьера-Леонэ ў Беларусі,** галоўным пунктам у супрацоўніцтве дзвюх краін стане сельская гаспадарка. Ён падкрэсліў, што разам з аховай здароўя і адукацыяй гэта адна з галоўных сфер, куды накіраваны ўсе сілы ўрада. «У нашай краіне і ў свеце высока цэняць беларускія тэхналогіі сельскай гаспадаркі, я маю на ўвазе беларускія сельскагаспадарчыя машыны. У Сьера-Леонэ ў сельскай гаспадарцы выкарыстоўваюцца мясцовыя машыны, якія не даюць высокай эфектыўнасці. Для нашай краіны выгадна выкарыстоўваць у сельскай гаспадарцы высокія тэхналогіі, мы зможам экспартаваць прадукты. І таму наша краіна мае патрэбу ў беларускіх тэхналогіях, каб умацоўваць нашу вытворчасць у гэтай сферы», — адзначыў пасол.

Навука

# АМБІЦЫЙНЫЯ ЗАДАЧЫ ДЛЯ МОЛАДЗІ

## па пабудове краіны будучыні



**Больш як 200 маладых даследчыкаў узялі ўдзел у рэспубліканскім маладзёжным форуме «Беларусь інтэлектуальная», арганізаваным Саветам маладых навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сярод іх пераможцы і лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных інтэлектуальных конкурсаў, прадстаўнікі працоўнай моладзі ў сістэме адукацыі і ў навукаёмістых сферах эканомікі.**

Мэтай форуму стала абмеркаванне і выпрацоўка таленавітай моладдзю прапаноў па вырашэнні шырокага кола задач для пабудовы Беларусі інтэлектуальнай.

— Бачанне такой мадэлі будучыні нашай краіны было адобрана на II з'ездзе вучоных Рэспублікі Беларусь у 2017 годзе з удзелам кіраўніка нашай дзяржавы. А магістральныя задачы былі сфармуляваны ў Стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018–2040», — падкрэсліў у сваім выступленні перад моладдзю **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі акадэмік Уладзімір ГУСАКОЎ** — Менавіта тым, хто сядзіць сёння ў зале, наканавана вырашаць амбіцыйныя задачы па пабудове краіны будучыні — Беларусі інтэлектуальнай.

Па словах Уладзіміра Гусакова, ва ўмовах пабудовы IT-краіны асобнай увагі заслугоўвае падрыхтоўка кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі. У Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі функцыянуе ўласная сістэма магістратуры, аспірантуры і дактарантуры. Пры гэтым стратэгічнай задачай з'яўляецца пабудова Акадэмічнага ўніверсітэта.

— Пытанне кадравага забеспячэння навуковай і інавацыйнай сфер з'яўляецца вызначальным для дасягнення пастаўленых мэт, — падкрэслівае Уладзімір Гусакоў. — Сёння ў краіне паспяхова функцыянуе цэласная сістэма работы з адоранай і таленавітай моладдзю. А Нацыянальная акадэмія навук Беларусі як вышэйшая навуковая арганізацыя краіны знаходзіцца на пярэднім плане работы з маладымі навукоўцамі. Пры гэтым асноўным крытэрыем у навуковай і інавацыйнай сферах з'яўляюцца не столькі колькасныя паказчыкі, а ў першую чаргу прафесіяналізм і якасны патэнцыял.

Важным кірункам на перспектыву з'яўляецца таксама работа з навучэнцамі. У нас і цяпер на пастаяннай аснове праводзяцца навукова-папулярныя лекцыі, майстар-класы для адораных школьнікаў, а таксама арганізоўваецца наведванне навукова-даследчых арганізацый. Але важна выйсці на новы ўзровень па выяўленні і суправаджэнні таленавітых даследчыкаў пачынаючы са школы. У сувязі з чым мы ставім задачу стварэння сеткі «акадэмічных» школ.

Па словах Уладзіміра Гусакова, сусветныя працэсы глабалізацыі, з аднаго боку, і прыярытэт уласных інтарэсаў дзяржаў на сусветнай арэне, з іншага боку, ужо зараз ставяць перад беларускім грамадствам цэлы комплекс праблем. У першую чаргу гэта датычыцца неабходнасці захавання ўласнай нацыянальнай ідэнтычнасці, культурных і духоўных каштоўнасцяў беларускага народа.

— Усё нарастаючае значэнне набываюць пытанні захавання гістарычнай памяці, — падкрэсліў кіраўнік Нацыянальнай акадэміі навук. — У апошнія гады намаганнямі спецыялістаў акадэміі акцэнтуецца ўвага на асновах беларускай дзяржаўнасці, адлюстраванні ў навуковых работах розных аспектаў гісторыі яе станаўлення і развіцця. Пры гэтым важнымі з'яўляюцца шырокая папулярызацыя сярод грамадзян вынікаў дадзеных даследаванняў, выкарыстанне найноўшых распрацовак у гэтай галіне ў мэтах умацавання дзяржавы, зыходзячы з нашых нацыянальных інтарэсаў.

Перспектыўнай бачыцца праграцоўка новага ідэалагічнага напаўнення жыццядзейнасці беларускай дзяржавы і грамадства. Як вядома, ідэі кіруюць светам. Узровень развіцця інфармацыйных тэхналогій ужо зараз ставіць шэраг пытанняў, звязаных з уздзеяннем на свядомасць цэлых сацыяльных груп у пэўных мэтах. Таму гуманітарная бяспека беларускага грамадства павінна выйсці на якасна новы ўзровень. У гэтай сувязі асаблівая адказнасць па захаванні і прымнажэнні гістарычнай памяці, культурных і духоўных каштоўнасцяў беларускага народа кладзецца менавіта на маладое пакаленне.

Праграма форуму ўключала тры блокі пытанняў: адукацыя ва ўмовах сучасных трансфармацый, штучны інтэлект і лічбавыя тэхналогіі, а таксама пабудова высокаінтэлектуальнага грамадства.

Па выніках форуму «Беларусь інтэлектуальная» была прынята дэкларацыя, накіраваная на актывізацыю ўдзелу моладзі ў вырашэнні задач па ўкараненні лічбавых тэхналогій ва ўсіх сферах беларускай эканомікі, развіцці новага індустрыяльнага комплексу краіны і фарміраванні высокаінтэлектуальнага грамадства.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Блізкая ўлада

# ПЫТАННІ І АДКАЗЫ

**Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 15 мая прамыя тэлефонныя лініі.**

Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 у суботу правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;
- намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Васілевіч КАНЮШКА. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Сцяпанавіч КАРАНІК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васілевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Дзяніс Мікалаевіч КУРЛЕНКА. Тэл. 8 017 500 41 60;
- старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

# Сярэдзіна мая пад знакам дажджу

## Па прагнозах сіноптыкаў, другая палова стане значна цяплей

**Пасля перыяду цёплага і сухога надвор'я да нас на гэтым тыдні прыйшлі дажджы, калі сітуацыя ў атмасферы кардынальна змянілася. Дажджы з навальніцамі чакаюцца ў Беларусі да канца тыдня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Так, сёння краіна застаецца ў зоне франтальных раздзелаў, якія ссоўваюцца з боку Украіны. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень месцамі прагрымяць навальніцы. Вецер паўднёва-ўсходні, паўднёвы ўмераны, пры навальніцах парывісты. Максімальная тэмпература паветра будзе ад 15 градусаў да 22 цяпла.

Месцамі ветрана і амаль паўсюдна дажджліва чакаецца і ў суботу. У гэты дзень надвор'е ў нашай краіне будзе вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску і няўстойлівая паветраная маса, якая распаўсюджваецца з паўднёвага захаду Еўропы. Уначы месцамі, удзень на большай частцы тэрыторы Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах навальніцы. Вецер паўднёвы, паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 7 градусаў да 12 цяпла. Удзень будуць камфортныя 14—21 градус са знакам плюс.

А вось у нядзелю да нас завітае амаль што лета. У гэты дзень дажджоў і воблачнасці стане менш, апаўдкі пройдуць месцамі і будуць насіць толькі кароткачасовы характар, удзень у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Умерана цёпла сіноптыкі абяцаюць ужо ўначы, калі тэмпература паветра складзе плюс 6—11 градусаў. А ўдзень будзе цудоўна: з плюс 18 градусаў аж да 24 цяпла. Аднак май!

**Сяргей КУРКАЧ.**

Як нас дураць

# ПАЦЯРПЕЛІ ДАВЕРЛІВЫЯ

## Жыхарка сталіцы ашукала знаёмых на $750 тысяч

**Прэс-сакратар МУС Вольга ЧАМАДАНАВА ў сваім Telegram-канале ўчора расказала пра тое, што праваахоўнікі спынілі злачынную дзейнасць адной занадта прадпрымальнай мінчанкі, якой за чатыры гады ўдалося выманіць у даверлівых знаёмых не менш за 750 тысяч долараў.**

Афёру даўгавых абавязацельстваў раскрылі аператыўнікі мінскага абласнога ўпраўлення ГУБАЗіК. У міліцыю звярнулася 35-гадовая мінчанка. Яна заявіла, што адна з жыхарак сталіцы не вяртае ёй 40 тысяч долараў, якія пазычыла быццам бы для развіцця бізнесу.

Высветлілася, што даўжніца выдумала гісторыю пра развіццё бізнесу па продажы дарагіх футраў, а патрацiла пазычаныя грошы на ўласныя патрэбы (хадзіла па рэстаранах, купляла дарагое адзенне і ўпрыгожванні, актыўна ездзіла ў экзатычныя туры).

Яшчэ чатыры чалавекі паверылі ў гісторыю аб набыцці зямельнага ўчастка і пазбавіліся $ 20 тысяч. Таксама жанчыне ўдалося тройчы прадаць канфіскаваны за сістэматычную нявыплату лізінгавых плацяжоў Mercedes-Benz S-класа. А самым буйным стаў падман 30-гадовага мінчаніна, які прадаў атрыманы ў спадчыну будаўнічы бізнес і ўсе грошы пазычыў знаёмай. Больш за тое, імкнучыся дапамагчы ёй, мужчына сам браў пазыку. Усяго ён перадаў «прадпрымальніцы» каля 500 тысяч долараў.

Пакуль устаноўлена дзесяць пацярпелых, ад якіх жанчына атрымала каля $ 750 тысяч. Супрацпраўную дзейнасць яна ажыццяўляла з 2017 года, у тым ліку з выкарыстаннем сваякоў і знаёмых, якія выконвалі ролю «служболвых» асоб розных арганізацый і ўстаноў.

Следчыя далі прававую ацэнку дзеянням затрыманай і завялі крымінальныя справы па фактах махлярства, здзейсненага ў буйным і асабліва буйным памерах.

Зараз устанаўліваюцца іншыя эпізоды супрацьпраўнай дзейнасці падазраванай і іншыя пацярпелыя, а таксама праваахоўныя мерапрыемствы па выяўленні датычнасці фігуранткі да легалізацыі сродкаў, здабытых злачынным шляхам.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Афганістане талібы захапілі яшчэ адзін раён, урадавыя сілы адступаюць



Прадстаўнікі радыкальнага руху «Талібан» абвясцілі, што яны ў выніку раптоўнай атакі захапілі цэнтр раёна Нерх, што ў правінцыі Вардак на захад ад Кабула. Губернатар правінцыі Вардак Абдул Рахман Тарык пацвердзіў страту кантролю над раёнам і дадаў, што ўрадавыя часткі сышлі з яго ў парадку «тактычнага адступлення». Гэта ўжо другі за тыдзень раён, захоплены талібамі. 5 мая яны занялі раён Барка ў правінцыі Баглан на поўнач ад сталіцы. Частата сутычак паміж талібамі і ўрадавымі сіламі і агульная напружанасць у Афганістане растуць па меры набліжэння 11 верасня — дня, на які прэзідэнт ЗША Джо Байдэн прызначыў канчатковы вывад амерыканскіх войскаў з краіны. Міністэрства абароны Афганістана заявіла, што мае намер адбіць раён у талібаў.

### Найбуйнейшыя крыптавалюты адчувальна патаннелі пасля заявы Маска

«Крыпта» патаннела ў сярэднім на 10 працэнтаў пасля заявы Ілана Маска пра тое, што Tesla не будзе прадаваць электрамабілі за біткоіны. «Мы заклапочаны тым, што для майнінгу і транзакцый з біткоінам выкарыстоўваецца ўсё больш арганічных крыніц энергіі, асабліва вугалю, а гэта з пункту гледжання выкідаў самае дрэннае паліва, — заявіў Маск. — Крыптавалюта — добрая ідэя, але яна не можа каштаваць навакольнаму асяроддзю так дорага». Ён адзначыў, што Tesla не будзе прадаваць свае біткоіны і плануе выкарыстаць іх, калі майнінг задзейнічае іншыя спосабы атрымання энергіі. Кампанія таксама вывучае крыптавалюты, якім патрабуецца менш чым 1 % энергіі, што выдаткоўваецца пры транзакцыі біткоінаў, дадаў мільярдэр. Другім фактарам падзення «крыпты» стаў у цэлым актыўны продаж рызыкоўных актываў на традыцыйных рынках, сказаў агенцтву Reuters супрацоўнік Amber Group Джэфры Уэнг. «Я не думаю, што ўсе распрадаюць з-за гэтых навін. Яны сталі свайго роду апошняй кропляй», — адзначыў ён.

### Дом Агаты Крысці ў Оксфардшыры выстаўлены на продаж



Аб гэтым паведаміла прэс-служба міжнароднага агенцтва нерухомасці Savills. «Дом Агаты Крысці — гэта знакавы аб'ект для Вялікабрытаніі, сапраўдны трафей, які з гадамі будзе толькі расці ў цане. Дом сёння складае 2,75 мільёна фунтаў стэрлінгаў», — адзначыла Юлія Аўчыннікава, дырэктар дэпартамента продажаў замежнай нерухомасці Savills у Расіі. Агата Крысці разам са сваім мужам купіла дом Вінтэрбрук у Уолінгфордзе (Оксфардшыр) у 1934 годзе. Пісьменніца пражыла ў ім да сваёй смерці ў 1976-м. Менавіта тут з-пад яе пяра з'явілася на свет вядомая на ўсім свеце «Міс Марпл» і былі напісаны апошнія кнігі пра Эркюля Пуаро.

# БЕЛАРУСКАЯ АМАЗОНКА

## ЗЯЛЁНАЯ МОДА

Пастулова беларусы пачынаюць адкрываць для сябе асобныя палескія сакрэты. Так, летась стрэліла Ельня — давялося вырашаць пытанні, дзе пракарміць вялікую колькасць аматараў балотных прыгод і як размеркаваць патокі турыстаў. Некаторыя аграсядзібы скарысталі гэты момант для развіцця ўласнага бізнесу і пачалі распрацоўваць новыя маршруты. А сёлетняй вясной народ паваліў глядзець на разліў Прыпяці. І гэта першыя «індыкатары», якія сведчаць, што Беларускай Амазонцы ёсць чым уразіць гасцей. Палессе валодае сапраўды неверагодным патэнцыялам, аснову яго складае вялікая сетка тэрыторый, якія ахоўваюцца. Турыстычныя маршруты і сцежкі створаны ў Нацыянальным парку «Прыпяцкі» і дзесяці заказніках. Многія дзяржаўныя прыродаахоўныя ўстановы развіваюць новыя напрамкі экалагічнага адпачынку: экскурсіі на балотаступах і балотаходах, выяўленне слядоў дзікіх жывёл, навучанне дайвінгу, паходы на платах, назіранне за зубрамі і іншымі жывёламі, фотапаляванне на глушцовых таках і многае іншае. У дакаранавірусныя часы цікавасць да зялёных падарожжаў пастулова расла, у 2019 годзе асабліва ахоўныя тэрыторыі наведала больш за 700 тысяч турыстаў, у тым ліку звыш шасці тысяч замежнікаў, яшчэ паўмільёна гасцей адпачыла на аграсядзібах.

Імклівы рост гарадскога насельніцтва і пры гэтым павышэнне яго мабільнасці ўплываюць на попыт адпачынку на прыродзе. Па прагнозах Сусветнай турысцкай арганізацыі, да 2030 года адбудзецца змена прыярытэтаў, турыстычныя патокі «пацякуць» у краіны з эканомікай, якая развіваецца. Ужо зараз людзі аддаюць перавагу нетрадыцыйным кірункам і малавядомым краінам. Да таго ж і пандэмія паўплывала на фарміраванне інтарэсаў: у трэндзе спакойны і бяспечны адпачынак, прыродныя ландшафты, флора, фаўна, унікальныя ўражанні. Варта падумаць і пра новыя катэгорыі падарожнікаў. Напрыклад, у Еўропе сярод самых актыўных турыстаў прадстаўнікі «сярэбранага» пакалення. Людзі сталага ўзросту не абмежаваны сямейнымі клопатамі і могуць спакойна распараджацца сваім часам. «Узроставыя» турысты любяць падарожнічаць невялікімі групамі і аддаюць перавагу адпачынку з камфортам. Неабавязкова для начлегу ім патрэбны нумары ў гатэлях, але будуць запатрабаваны ўтульныя домікі і пэўны ўзровень сэрвісу. Маладыя аматары прыроды больш схільныя да поўнага паглыблення: ім цікава падарожнічаць з мясцовым гідам, каштаваць тутэйшыя прадукты і знаёміцца з традыцыямі рэгіёна. Расце колькасць турыстаў, якія любяць падарожнічаць толькі сваёй сям'ёй. Пад такую мэтавую групу неабходна прадумваць пэўныя праграмы і для дарослых, і для дзяцей.

## «РАСКРУЦІЦЬ» РЭГІЁН

Гаворка аб тым, чым і як можа завабіць Беларуская Амазонка, вялася падчас круглага стала «Патэнцыял агратурызму і экатурызму на Палессі», у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі экалагічнай і дзелавой грамадскасці, Мінспорту і Мінлясгаса, міжнародныя эксперты.

Апошнім часам вельмі шмат гаворыцца пра ўнёсак у эканоміку ад IT-індустрыі, але мала хто звяртаў увагу на тое, што турызм давая не менш прыбытку. Да таго ж ён дазваляў зарабіць і іншым галінам, бо тут не абысціся без аказання транспартных паслуг, харчавання, набыцця тавараў.

**Намеснік дырэктара Бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага Алесь ГЕРАСІМЕНКА** звярнуў увагу, што турызм менш патрабавальны ў плане інвестыцый у параўнанні, напрыклад, з прамысловасцю і транспартнай галіной і ў той жа час хутчэй можа даваць аддачу. Тут працсей і танней стварыць працоўныя месцы, што для поўдня Беларусі сапраўды актуальна. Да таго ж гэта ўкладанні ў будучыню. Справа ў тым, што тут пражывае вялікая колькасць дзяцей, і па часе іх сталення могуць узнікаць праблемы з працаўладкаваннем і адтокам насельніцтва.

Замежны вопыт паказвае, што турызм можа спрыяць сацыяльна-эканамічнаму развіццю рэгіёна. Пра яго не трэба забывацца ў тым ліку і пры распрацоўцы іншых праектаў. Напрыклад,такога, як рэканструкцыя воднага шляху Е40, які можа паўплываць на экалогію рэгіёна, і ў той жа час не выключаны рызыкі, што праект не акупіцца (пандэмія паказала, як лёгка могуць быць парушаны гандлёвыя сувязі з іншымі краінамі). Папярэдне стварэнне беларускага ўчастка воднага шляху Е40 ацэнена ў адзін мільярд еўра. Калі гэтыя грошы пераарыентаваць на турызм, можна стварыць тысячы новых працоўных месцаў.



Фота Анатолія КЛЕШЧУКА.

Па ўсёй Беларусі прырастае колькасць аграсядзіб, але ў Гомельскім Палессі гэты туркірунак пакуль прасядае. Неабходна падумаць і пра тое, што трэба зрабіць для таго, каб уласнікі сядзіб пачалі «тыражаваць» свой бізнес. Апытанне ўладальнікаў домікаў на вёсцы паказала, што большасць суб'ектаў не ставяць планаў на пашырэнне і стварэнне новых сядзіб.

Варта больш намаганняў прыкласці для раскруткі турызму на базе лясного фонду. Калі нацпаркі краіны ўжо знайшлі спажыўцоў для сваіх паслуг, то патэнцыял заказнікаў пакуль не раскрыты.

**Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута эксперыментальнай батанікі Дзмітрый ГРУМО** развянчаў міф пра тое, што не створана інфраструктура для турызму ў лясной гаспадарцы. Многія лесагаспадарчыя арганізацыі маюць разнастайныя аб'екты, якія можна выкарыстоўваць для прыцягнення гасцей: вальеры, дэндрапаркі, дэндрасады і фрагменты старажытных паркаў. Прамысловыя аб'екты — дрэваапрацоўчыя, пасекі, месцы вырошвання буякоў, журавін — таксама можна паказваць турыстам. Маюцца і хаткі для адпачынку, створана 70 турмаршрутаў, прапануецца карпаратыўны адпачынак, расце цікавасць да беларускай прыроды ў замежных назіральнікаў за птушкамі. Трэба толькі навучыцца ўсё гэта манетызаваць, бо пакуль турыстычныя паслугі не даюць жаданага прыбытку. Усё таму, што для лясной гаспадаркі турыстычная дзейнасць не з'яўляецца галоўнай. Існуе праблема прававога рэгулявання доступу ў лес, карыстання рэсурсамі. Калі ў найбольш эфектыўных еўрапейскіх мадэлях лясной гаспадаркі дзяржава ці іншыя ўласнікі не перадавяраюць землі трэцім асобам (арандатарам) і стараюцца распараджацца самі, у нас такая мадэль яшчэ павінна быць створана. Леснікам нявыгадна ствараць экасцежкі, калі прыбытак з іх выкарыстання пасля будуць мець іншыя, напрыклад, прыродаахоўныя ўстановы. Не хапае кадраў, якія маглі б займацца кваліфікаваным менеджментам і развіваць турпаслугі. Дзмітрый Генадзевіч упэўнены, што трэба ствараць нарматыўна-прававую базу, якая будзе рэгуляваць узаемаадносіны розных суб'ектаў. Няма сэнсу закладаць усё — ад пунктаў харчавання і размяшчэння турыстаў да арганізацыі для іх забаўляльных праграм — выключна на базе лясной гаспадаркі. Важна ўключацца ва ўжо існуючыя кластары, супрацоўнічаць з мясцовымі ўладамі, установамі культуры, аграсядзібамі, мясцовымі жыхарамі. А раскручваць рэгіён можна самымі рознымі спосабамі. Напрыклад, ладзіць тэматычныя фестывалі ці ствараць брэнды. Сёння сабрана багата інфармацыі пра беларускія балоты. А чаму не выкарыстаць пашпарты, створаныя на іх? Так турысты могуць спаборнічаць, хто больш прайшоў розных балотных маршрутаў, атрымліваць значкі. Вучоныя вылучылі пэўныя зоны росту — улічылі не толькі прыродны патэнцыял, але і ўжо існуючую інфраструктуру, транспартную сетку, гісторыка-культурную спадчыну. Важна і пралічыць, як можна больш эфектыўна выкарыстаць прыродныя багацці. Напрыклад, ставіцца пытанне аб змене статусу Альманскіх балотаў з лінейнага лясгаса на нацпарк, элемент трансгранічнай сусветнай спадчыны.Так, можна арыентавацца на ахову і экатурызм альбо атрымліваць грошы... з журавін — меnавіта на Альманскіх балотах ураджаі гэтай ягады адны з самых вялікіх. Драўніна, ды яшчэ з улікам яе цяжкадаступнасці на забалочаных тэрыторыях, дае ў разы менш прыбытку, чым нарыхтоўка карысных ягад. Зноў жа, «эфектны» збор журавіннага ўраджаю можна паказваць турыстам.

Пры развіцці рэкрэацыйных зон неабходна пралічваць, якой будзе нагрузка на прыроду. Нават дзякуючы элементарнаму добраўпарадкаванню можна размяркоўваць людскія патокі. Да таго ж стварэнне інфацэнтраў, указальнікаў, альтанак спрашчае жыццё арганізаваных турыстаў і тых, хто падарожнічае самастойна.

**Ужо зараз людзі аддаюць перавагу нетрадыцыйным кірункам і малавядомым краінам. Да таго ж і пандэмія паўплывала на фарміраванне інтарэсаў: у трэндзе спакойны і бяспечны адпачынак, прыродныя ландшафты, флора, фаўна, унікальныя ўражанні.**

## ПА МЯДОВАЙ РАЦЭ

Магчыма, прыйшоў час распрацаваць праграму развіцця аграэкатурызму на Палессі. Варта скласці рэестр аграсядзіб, лясгасаў, аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, паслуг, якія могуць зацікавіць турыстаў, і больш рэкламаваць рэгіён як на ўнутраным, так і на сусветным рынках. Асобныя цікавосткі Беларускай Амазонкі былі агучаны падчас круглага стала.

Некалькі гадоў таму па рэках Палесся пачаў хадзіць першы круізны лайнер «Белая русь». Адзін з яго маршрутаў, багаты на наведванне культурных і гістарычных аб'ектаў, разлічаны на восем сутак. Беларускія аграсядзібы прапануюць уласныя інавацыйныя праекты, экалагічна чыстыя прадукты, міні-музеі, забаўляльныя праграмы і турмаршруты. Запушчана новая праграма па стварэнні і раскручванні новага брэнда «Наваколле» — турысты змогуць атрымаць ежу і сувеніры, створаныя з выкарыстаннем традыцыйных прадуктаў, промыслаў, вобразаў. Мала хто ведае, што на Палессі захоўваецца папуляцыя коней, якая вядзе паходжанне ад зніклага дзікага лясного віду тарпана. Гэтых невялікіх, як поні, конікаў традыцыйна выкарыстоўвалі ў сельскай гаспадарцы. За доўгі час у суровых умовах Палесся з вялікай вільготнасцю і небагатым кормам жывёлы выпрацавалі адаптыўныя якасці. Месцічы цанілі сваіх гадаванцаў за спакойны характар: ну якога яшчэ каня можна перавезці праз раку на вузкай лодцы? І сёння гэтыя коні маглі б выкарыстоўвацца ў турызме.

Цэнтрам прыцягнення гасцей можа стаць і бортніцтва, якое пашырана на Палессі, тым больш што з мінулага года яно ўключана ў спіс культурных каштоўнасцяў чалавецтва. Ад пчалярства яно адрозніваецца падыходамі і інструментамі. Напрыклад, бортнікі не засяляюць пчол, а прываблівацаюць і даглядаюць іх. Промысел уключае ў сябе звычаі і абрады. Для носьбітаў практыкі (а вучэцца бортніцтву трэба 15 і больш гадоў) важна захаванне прасторы. Да лесу і дрэва яны могуць ставіцца з не меншай павагай, чым да пчалы. Сёння захавальнікі традыцыйнага промыслу даглядаюць каля 2,5 тысячы калод і борцяў. Найбольш «мядовая» цэнтральная частка беларускага Палесся. У Лельчыцкім раёне амаль у кожнай вёсцы жыве носьбіт традыцыі, і нават ёсць вуліцы, вёскі, дзе жывуць сем'і бортнікаў. Нездарма раку Убарць, уздоўж якой сяліліся людзі, што спрадвеку даглядаюць пчол, празвалі мядовай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Анонс

## ЯКУБ КОЛАС: З АБАЯНІ — У МІНСК

**Жыццё народнага песняра Беларусі самым цесным чынам звязана з рознымі куточкамі на постсавецкай прасторы. Адзін з коласаўскіх адрасоў — горад Абаянь на Куршчыне, дзе пісьменнік амаль шэсць гадоў знаходзіўся разам з сям'ёй. Знаходзіўся «далёка... ад межаў родных». Гэта Першая сусветная вайна прымусіла паэта да пераезду ўглыб Расійскай імперыі, службы і ўдзелу ў ваенных дзеяннях. Спярша — Масква, затым — Перм, Румынскі фронт...**

У верасні 1917 года Якуб Колас прыехаў у Абаянь Курскай губерніі, дзе на той час знаходзілася ў эвакуацыі Марыя Дзмітрыеўна з сынамі Данілам і Юрыем. Згодна з дэкрэтам урада, Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча як настаўніка вызвалілі ад вайсковай службы, і ён адразу ўзяўся за працу. Настаўнічаў у школах у вёсцы Малыя Крукі, затым у вёсцы Другі Ліпавец на Куршчыне. На пачатку 1921 года Народны камісарыят асветы Беларускай ССР накіраваў Наркамасветы РСФСР А. В. Луначарскаму тэлеграму з просьбай вярнуць у Беларусь «школьнага інструктара Канстанціна Міцкевіча (псеўданім — Якуб Колас), аднаго з лепшых беларускіх пісьменнікаў». 15 мая 1921 года Якуб Колас з сям'ёю пераехаў з Курскай губерні ў Мінск.

Актыўная навуковая, грамадская, асветніцкая дзейнасць Якуба Коласа па вяртанні на Бацькаўшчыну спалучалася з літаратурнай — галоўнай справай жыцця паэта. З-пад яго пяра выйшлі апавяданні «Сяргей Карага», «Дачакаўся», «Крывавы вір», «Курская анамалія», «Ванька Кудлаты», «Туды, на захад!», сюжэты якіх навеяны ўспамінамі аб Курскай зямлі.

Усё гэта і стала лейтматывам часовай экспазіцыі «Туды, на захад!» (Абаян — Мінск)», якая будзе разгорнута ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа 15 мая 2021 года а 16-й гадзіне і прысвечана 100-годдзю вяртання Якуба Коласа ў Беларусь. У часовай экспазіцыі будуць прадстаўлены матэрыялы аб педагагічнай дзейнасці Якуба Коласа на Куршчыне, у Белпедтэхнікуме, Беларускім дзяржаўным універсітэце, настаўніцкіх курсах у Слуцку, навуковай дзейнасці ў Інбелкульце, Акадэміі навук, рукапісы і фотаздымкі пісьменніка, выданні твораў розных гадоў.

**Сяргей ШЫЧКО.**

По палічках

# ЖЫЛЛЁ — У ДОБРЫЯ РУКІ

## Як выбраць кватэру на другасным рынку

**По словах спецыялістаў, за апошнія некалькі месяцаў рынак другаснага жылля прыкметна ажывіўся. Колькасць прапаноў з розных крыніц можа заблытаць любога: які раён выбраць, якую планіроўку, як набыць кватэру без праблем з папярэднімі гаспадарамі. Пра асноўныя фактары, на якія трэба звярнуць увагу пры выбары аб'екта на другасным рынку, распавяла дырэктар аднаго са сталічных агенцтваў нерухомасці Кацярына ФІЛОНЧЫК.**

**Вызначце ваш бюджэт.** Устанавіце суму, якую вы гатовыя вылажыць за кватэру. Найбольшай папулярнасцю карыстаецца жыллё без адстройвання. Такія кватэры звычайна называюць «каробка». Жыць там да поўнага рамонту нельга, затое кошт будзе меншы — і на першасным, і на другасным рынках. Гатоўнасць кватэры да жыцця для многіх можа быць як мінусам, так і плюсам. Не забывайцеся, што ўсё можна перарабіць «пад сябе». У інтэрнэце хапае прыкладаў, дзе на аснове бабуліных хрушчоўскіх пакояў стварылі ўльтрасучасную кватэру-студыю.

**Падбярыце месцазнаходжанне.** Кошт будзе залежаць і ад раёна горада. Цяпер актыўна будуюцца вялікія жылыя комплексы. Кватэры там карыстаюцца попытам, таму што разам з жылым кварталам ствараецца і неабходная інфраструктура: дзіцячыя ўстановы, крамы, офісы, гандлёвыя цэнтры. Увогуле, з плюсоў новых дамоў можна вылучыць прасторныя і чыстыя пад'езды, ахову дома вартаўніком, відэаназіранне, закрытую тэрыторыю двара і паркоўкі. Прадаюць кватэры ў новых дамах пераважна забудоўшчыкі, аднак прапановы ад фізічных асоб таксама сустракаюцца.

Упэўніцеся, што не будзе праблем з транспартам. Зразумела, кватэры побач з метро прапануюцца па больш высокай цане. У выпадку, калі ў вас ёсць аўтамабіль і фактар транспарту не будзе вырашальным, зону пошукаў можна пашырыць. Калі асабістага транспарту ўсё ж няма, правярайце даступнасць па напрамках, важных менавіта для вас. Напрыклад, ці зможаце вы хутка дабрацца да работы.

**Свежае адстройванне ў кватэры, асабліва ў старым доме, можа быць спробай схаваць відавочныя дэфекты, у тым ліку сляды затаплення або пажару, што можа значна паўплываць на кошт пакупкі.**

**Звяртайце ўвагу на паверх.** Кватэра на першым будзе больш танная. Прычыны зразумелыя — шум з вуліцы, дапытлівыя людзі, якія могуць зазіраць у вокны... Калі ўсё ж выбар выпадае на такі варыянт, даведайцеся пра стан падвала. Праблемы адтуль могуць «перайсці» і ў кватэру. Апартаменты на самых высокіх паверхах — таксама пытанне спрэчнае. Вялікае значэнне мае сам дом. Калі ён новы, асаблівых праблем звычайна не ўзнікае. Калі дах дома ўжо «знасіўся», разам з пакупкай вы можаце атрымаць падцёкі на столі падчас дажджу.

**Паглядзіце сваімі вачыма.** Адна з пераваг пакупкі на другасным рынку — магчымасць паглядзець жыллё. Купляючы «метры», дзе дом толькі будуецца, вы атрымліваеце схему-планіроўку. Калі кватэра гатовая, а тым больш старой пабудовы, ацаніце яе. Стан можа выклікаць пытанні. Аднак калі гаспадару няма чаго ўтойваць, ён пагодзіцца на паказ. У самой кватэры абавязкова праверце стан сцен, падлогі і столяў. Памятайце, што свежы рамонт, асабліва ў старым доме, можа быць спробай схаваць відавочныя дэфекты, у тым ліку сляды затаплення або пажару, што можа значна паўплываць на кошт пакупкі. Распытаць суседзяў наконт кватэры і яе гаспадара таксама будзе карысна. Пры належным падыходзе ад трэціх асоб можна даведацца пра самыя нечаканыя факты.

**Падрыхтуйце дакументы.** Прыналежнасць нерухомасці прадаўцу, а таксама наяўнасць у яе абмежаванняў або абцяжарванняў правяраецца натарыусам або рэгістратарам пры засведчанні дагавора куплі-продажу і пры яго дзяржаўнай рэгістрацыі. Для здзелак выкарыстоўваюцца толькі арыгіналы дакументаў на аб'ект нерухомасці. Калі ў жылля некалькі ўласнікаў, спатрэбіцца згода на продаж ад кожнага з іх. У выпадках, калі кватэра або дом знаходзяцца ў сумеснай уласнасці мужа і жонкі, продаж адным з іх магчымы толькі са згоды іншага. Агенцтвы нерухомасці могуць запатрабаваць пашыраны пакет дакументаў ад прадаўца. Напрыклад, даведкі аб адсутнасці псіхалагічных захворванняў, якія могуць пацягнуць адсутнасць адказнасці за свае дзеянні, а таксама небяспечных інфекцыйных захворванняў ва ўласніка і членаў яго сям'і, што пражываюць у аб'екце нерухомасці.

Пералік усіх афіцыйных дакументаў, якія неабходны рэгістратару для пацвярджэння здзелкі, змешчаны ва Указе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 200 ад 26 красавіка 2010 года з апошнімі яго змяненнямі і дапаўненнямі. Дагавор куплі-продажу дапаўняецца двума актамі — актам перадачы аб'екта і актам аплаты. Пасля падпісання кожным з удзельнікаў здзелкі дагавор абавязкова рэгіструецца ў агенцтве па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры.

Увогуле, для бяспечнага набыцця кватэры лепш за ўсё звярнуцца да спецыялістаў па нерухомасці, якія правядуць пільны аналіз неабходных дакументаў, якасна аформяць дагавор куплі-продажу і абмяркуюць з удзелам двух бакоў усе важныя для вас моманты.

**Марыя ТАРНАЛІЦКАЯ.**

# ВОДНЫЯ, ВЯРЧАЛЬНЫЯ, ПЕРАСОВАЧНЫЯ...

### ЛІЦЭНЗІІ НА ЗАБАЎЛЯЛЬНЫЯ ПРЫЛАДЫ

Падзенне і разбурэнне асобных атракцыёнаў і траўматызм іх наведвальнікаў сталі падставай для таго, што з 2009 года за станам атракцыёнаў у Беларусі пільна сочыць Дзяржпрамнагляд, расказаў **Пётр КЛІМКО, начальнік упраўлення нагляду за бяспекай пад'ёмных прыстасаванняў і атракцыёнаў Дэпартамента па наглядзе за бяспечным вядзеннем работ у прамысловасці МНС:**

*— Апошнім часам пытанні бяспекі механізаваных атракцыёнаў і водных горак з высокімі і сярэднімі ступенямі рызыкі, адносна якіх ажыццяўляецца дзяржнагляд, рэгулююцца тэхнічным рэгламентам Еўразійскага эканамічнага саюза аб бяспецы атракцыёнаў, а таксама законам Беларусі аб прамысловай бяспецы і правіламі па гарантаванні прамысловай бяспекі атракцыёнаў.*

Абазначаныя правілы распаўсюджваюцца на забаўляльныя прылады са ступенямі патэнцыйнай біямеханічнай рызыкі РБ1 і РБ2 (з пад'ёмам на вышыню ад двух і вышэй метраў і хуткасцю ад 10 і больш метраў за секунду). Гэта механізаваныя атракцыёны з разнастайнымі рухамі: паступальнымі, вярчальнымі і складанымі. А таксама водныя немеханізаваныя спускі: прамыя і з віражамі. Мантаж, наладка, абслугоўванне, рамонт і тэхнічнае дыягнаставанне атракцыёнаў падлягаюць ліцэнзаванню.

Аб'ектыўны фактар, які сведчыць пра бяспеку атракцыёнаў, — паказчык траўматызму і аварыйнасці падчас іх эксплуатацыі. Пасля пачатку нагляду за забаўляльнымі прыладамі аварый з атракцыёнамі і няшчасцяў з іх пасажырамі, якія прывялі да цяжкіх траўмаў ці смерці, не здаралася. Пры гэтым у 2016-м два няшчасныя выпадкі



(адзін — лятальны) адбыліся. Аднак яны не былі звязаны з тэхнічным станам абсталявання, а выкліканы неадэкватнымі дзеяннямі пацярпелых, калі тыя самавольна ўвайшлі ў рабочую небяспечную зону рухомых частак атракцыёнаў падчас іх выкарыстання, адзначыў Пётр Клімко.

*— Пільную ўвагу Дзяржпрамнагляд удзяляе падрыхтоўцы спецыялістаў і персаналу, якія займаюцца абслугоўваннем і кіраваннем атракцыёнамі. Асноўныя прычыны няшчасных выпадкаў з пасажырамі і наведвальнікамі абумоўлены менавіта памылкамі персаналу. Яны недастаткова падрыхтаваныя, не ўмеюць дзейнічаць у пазаштатных сітуацыях, недысцыплінаваныя. Недзе недагледзелі, не прышпілілі, не тую кнопку націснулі... Са слоў уладальнікаў атракцыёнаў, склад тых, хто іх абслугоўвае, за сезон можа абнавіцца двойчы, а то і тройчы. Работнікаў, якія працуюць з году ў год, няшмат, бо гэта, як правіла, сезонны занятак, за які плацяць мала.*

Вядома, і самі пасажыры дзеля сваёй бяспекі павінны няўхільна выконваць правілы паводзін, якія размешчаны на стэндах перад кожным атракцыёнам. Там указваецца яго назва, дата допуску да эксплуатацыі і наступнага агляду, нумар арганізацыі-ўладальніка і самі правілы. Калі такога стэнда няма, то катацца на ім эксперты не рэкамендуюць.

### «МІКС», «БРЫГАНЦІНА», «ТАНЦАВАЛЬНАЯ ВЕРАНДА»

У чатырох сталічных парках налічваецца 55 атракцыёнаў. 19 — у парку Чалюскінцаў, 21 — у Цэнтральным дзіцячым парку імя Горкага, 7 — у парку імя 50-годдзя Вялікага Кастрычніка, 8 — у парку імя 900-годдзя Мінска. Работы па замене вядуцца планава. Летась, напрыклад, у парку імя Горкага з'явіўся механізаваны атракцыён «Мікс», а ў парку Чалюскінцаў — цэлая пляцоўка з атракцыёнамі для дзяцей ад трох да 12 гадоў, дзе паставілі новы гульнявы комплекс, падзяліўся **Руслан КАСЕВІЧ, начальнік упраўлення «Гарадскія паркі» ўнітарнага прадпрыемства «Мінскзелянбуд»:**

*— Сёлета ў парку Горкага з'явіцца новы трохузроўневы дзіцячы гульнявы комплекс – лабірынт. Атракцыён будзе ўсталяваны на месцы рускіх арэляў, якія адпрацавалі свой рэсурс. А на змену пакою смеху прыйдзе павільён з гульнявымі сімулятарамі. Сюрпрызам стане і комплекс «Брыганціна», які ўсталююць з боку вуліцы Першамайская. Гэта сапраўдны карабель з мачтамі, элементы якога выкананы з дрэва і пластмасы. Пад гульнявым комплексам «Цытадэль Нармандыя» зробяць удасканаленае пакрыццё для большай бяспекі малых.*

Некалькі гадоў таму ў парках Горкага і Чалюскінцаў укаранілі зручную прапускную сістэму пляцяжоў. На ўваходах на атракцыёны ўстаноўлены турнікеты, якія счытваюць QR-коды на білетах, а таксама зроблены пластыкавыя карткі наведвальнікаў. Летась з'явілася магчымасць аплачваць паслугі ў парках праз інтэрнэт і мабільны.

Штодзень усе гульнявыя комплексы будуць апрацоўвацца аэразольнымі антысептыкамі, а на саміх атракцыёнах з'явіцца антысептык для індывідуальнага выкарыстання наведвальнікамі. Парк Чалюскінцаў таксама будзе апрацаваны прэпаратамі супраць кляшчоў, паколькі менавіта там былі знойдзены гэтыя небяспечныя насякомыя. У іншых парках такой патрэбы няма, запэўніў Руслан Касевіч.

**За апошняе дзесяцігоддзе ў краіне з'явілася 111 новых прылад, за якімі назірае дэпартамент. Пад наглядам органа 55 арганізацый, якія эксплуатуюць 245 патэнцыйна небяспечных атракцыёнаў. З іх 182 — стацыянарныя прылады, 21 — перасовачная, 42 — водныя. 84 атракцыёны ў сталіцы належаць 12 суб'ектам гаспадарання, 49 з якіх стацыянарныя, 24 — водныя горкі (14 — эксплуатуюцца круглы год) і 11 — перасовачныя. Тэрмін службы адпрацавалі 47 з іх (56 % ад агульнай колькасці паднагляднага абсталявання).**

Мяркуецца, што сёлета ў парку Горкага ўсталююць яшчэ і пляцоўку з драўлянымі казачнымі фігурамі, дызайн якой пакуль прапрацоўваецца, як і праектна-каштарысная дакументацыя на рэстаўрацыю цэнтральнай уваходнай аркі парку Горкага, якая з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

У кожным парку ёсць дзіцячая гульнявая пляцоўка з пясочніцамі, трэнажорамі і іншымі забавамі. З 1 мая па сталічных парках пачаў вандроўку перасовачны комплекс ад гістарычнага музея. Маленькія наведвальнікі змогуць зазірнуць на экскурсію ўнутр тэматычнага фургона і паўдзельнічаць у конкурсах.

**Асноўныя прычыны няшчасных выпадкаў з пасажырамі і наведвальнікамі абумоўлены менавіта памылкамі персаналу. Яны недастаткова падрыхтаваныя, не ўмеюць дзейнічаць у пазаштатных сітуацыях, недысцыплінаваныя.**

Дарослым наведвальнікам у парку Чалюскінцаў прапануюць завітаць на «Танцавальную веранду».

*— Прыходзяць сюды ў асноўным людзі 45+, сустракаюцца і больш маладыя. Летась быў 101-гадовы танцор,* — пахвалілася **Лідзія ВЕЖНАВЕЦ, начальнік культурна-масавага сектара ўпраўлення «Гарадскія паркі» ўнітарнага прадпрыемства «Мінскзелянбуд».** — *Кожную суботу і нядзелю з чатырох гадзін мы чакаем тут танцораў. А на гэтых выхадных пачынаем праграму для моладзі (з сямі да дзевяці вечара), куды запрашаем яшчэ і сем'і з малымі.*

Варта нагадаць усім, што непаўналетнім да 16 гадоў нельга знаходзіцца на вуліцы без дарослых з дзесяці гадзін вечара да шасці раніцы.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Хойникский КБО»** (УНП 400056519), 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 28, тел.: +375 232 31-59-72, +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **27 мая 2021 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение, инв. № 343/С-94164, площадь – 1266,0 кв. м (Дом быта) Гомельская обл., г. Хойники, ул. Карла Маркса, 27 | 204 750,00 |
| 2 | Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4198 | 10,00 |
| 3 | Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4199 | 10,00 |
| 4 | Станок для изготовления ключей, 2005 г. в., инв. № 4204 | 650,00 |
| 5 | Обувная швейная машина Xflysphing-2972, 2005 г. в., инв. № 1037 | 205,00 |
| 6 | Водонагреватель «Аристон», 2012 г. в., инв. № 7089. Комплект оборудования для организации рабочего места по оказанию парикмахерских услуг, 2003 г. в., инв. № 7086 | 2265,00 |
| 7 | Сейфы металлические в ассортименте (3 шт.) *(2-секц. – 1 шт., 1-секц. – 2 шт.)* | 96,00 |
| 8 | Воздухонагреватель, 2012 г. в., инв. № 7091 | 30,00 |

**Местонахождение – п. 2–8 Гомельская обл., г. Хойники, ул. К. Маркса, 27. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 15.05.2021 г. по 17.00 26.05.2021 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 23.04.2021 г.

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «БелДрев»** (УНП 500541442) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30 (дело № 180-4Б/2017 экономический суд Минской области).

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **31 мая 2021 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Минимальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-1104 (проходная), общей площадью 20,1 м², капитальное строение с инвентарным номером 400/С-57475 (административно-бытовой и производственный корпус), общей площадью 3059,8 кв. м, капитальное строение с инвентарным номером 400/С-60762 (склад листовых материалов), общей площадью 234,9 кв. м | 1 514 700,00 | 925 650,00 |
| 2 | Сушильная печь для древесины Multilevel 7000, серийный номер 14533, инв. № 2501 | 212 400,00 | 47 200,00 |
| **Местонахождение – г. Гродно, ул. Карского, 2А** | | | |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 15.05.2021 г. 09.00 по 28.05.2021 г. 16.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов и задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Обременения отсутствуют. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Срок оплаты предмета торгов – не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 02.04.2021 г.

В **суд Речицкого района Гомельской области** поступило заявление об объявлении умершим РАГОВСКОГО Ивана Ивановича, 09 сентября 1964 года рождения, последнее известное место жительства – Гомельская область, Речицкий р-н, аг. Солтаново, ул. Речная, д. 8.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Раговском Иване Ивановиче, в течение двух месяцев с момента публикации определения сообщить эти сведения суду Речицкого района.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: изолированное помещение, инв. № 400/D-195838 (назначение – складское помещение, наименование – склад), обшей площадью 162,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. 1 Мая, 28/2-1 и ограждение металлическое на металлический столбах, протяженностью 37,94 м п.

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 440100000002009150, площадью 0,0752 га (назначение – для обслуживания здания гаражей), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. 1 Мая, 28/2. На земельном участке расположены иные капитальные строения и изолированные помещения не подлежащие реализации. Оформление прав на земельный участок будет производится в соответствии с законодательством Республики Беларусь

Начальная цена продажи – 77 280 руб. (семьдесят семь тысяч двести восемьдесят рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 7 728 руб. (семь тысяч семьсот двадцать восемь рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

**Продавец – Гродненское областное потребительское общество, 230023, г. Гродно, ул. 1 Мая, д. 28, тел. 72-30-50, факс 72-00-67**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70**

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 02 июня 2021 г. в 11.00**
**по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grino.by/aukcion/

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.11.2020 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 31 мая 2021 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**
**Дополнительная информация http://grino.by/**

### РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества УП «БРОВКИ МИНСКЗЕЛЕНСТРОЯ» (Продавец)

**Лот № 1:** Пресс-подборщик ПР-Ф-750, инв. № 347. Начальная цена с НДС – 1 421,38 руб. **Лот № 2:** Пресс-подборщик ПРФ-180, инв. № 348. Начальная цена с НДС – 1 265,50 руб. **Лот № 3:** Комбайн зерноуборочный «Лида»-1300, инв. № 375. Начальная цена с НДС – 17 485,56 руб. **Лот № 4:** Грабли валкователи ГВЦ-6,6, инв. № 465. Начальная цена с НДС – 4 534,98 руб. **Лот № 5:** Косилка Л-501Д, инв. № 483. Начальная цена с НДС – 473,18 руб. **Лот № 6:** Автомобиль VOLKSWAGEN JETTA, кузов (рама) WVWZZZ1KZ8M144620, 2008 г. в. Начальная цена с НДС – 4 510,04 руб. **Лот № 7:** Автомобиль GREAT WALL HOVER, кузов (рама) LGWFFCA559B097726, 2008 г. в. Начальная цена с НДС – 2 754,07 руб. **Лот № 8:** Автопогрузчик Амкодор 451А, инв. № 499. Начальная цена с НДС – 7 578,65 руб. **Лот № 9:** Косилка дисковая навесная КДН-3,1, инв. № 466. Начальная цена с НДС – 2 307,47 руб. **Лот № 10:** Воздушно-решетный сепаратор Петкус-селектра К-218, инв. № 324. Начальная цена с НДС – 3 955,07 руб. **Лот № 11:** Сепаратор аэродинамический САД-1, инв. № 389. Начальная цена с НДС – 692,74 руб. **Лот № 12:** Протравливатель семян ПСС-20, инв. № 338-1. Начальная цена с НДС – 1 063,38 руб. **Лот № 13:** Погрузчик шнековый ПШ-6, инв. № 454. Начальная цена с НДС – 259,45 руб. **Лот № 14:** Погрузчик шнековый ПШ-6, инв. № 455. Начальная цена с НДС – 259,45 руб. **Лот № 15:** Автомобиль ГАЗ 3507 -01, кузов (рама) X3E35070180096135/ 33072080961018, 2008 г. в. Начальная цена с НДС – 3 474,90 руб. **Лот № 16:** Рама лесопильная вертикальная одноэтажная Р63-4Б, инв. № 1331. Начальная цена с НДС – 2 663,09 руб. **Лот № 17:** Станок брусовочный СБ18, инв. № 821-1. Начальная цена с НДС – 1 650,04 руб. **Лот № 18:** Станок круглопильный М459-03 (45кВт), инв. № 822-1. Начальная цена с НДС – 1 613,66 руб. **Лот № 19:** Станок для обработки горбыля , инв. № 823-1. Начальная цена с НДС – 1 234,79 руб. **Лот № 20:** Оборудование для сушки древесины, инв. № 832. Начальная цена с НДС – 2 569,28 руб. **Лот № 21:** Станок для обработки горбыля ЯИМБ04-213201, инв. № 835. Начальная цена с НДС – 966,24 руб.

**Местонахождение Лотов №№ 1, 2, 4–9, 15–21:** Минская обл., Минский р-н, д. Бровки; **Лотов №№ 3, 10–14:** Минская обл., Минский р-н, д. Селище.

**Аукцион состоится 16.06.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

### РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже автомобилей Учреждения «БЕЛТРАНССПЕЦАВТО» (Продавец)

**Лот № 1:** Легковой седан (sedan) MERCEDES-BENZ S500, кузов (рама) № WDD2210711A009899, г. в. – 2006. Начальная цена без НДС – 16 900,00 руб.

**Лот № 2:** Легковой седан MERCEDES-BENZ S500 L, кузов (рама) № WDD2211711A181081, г. в. – 2007. Начальная цена без НДС – 23 400,00 руб.

**Лот № 3:** Легковой внедорожник универсал (suv universal) BMW X5, кузов (рама) № WBAFB91070LN97117, г. в. – не определен. Начальная цена без НДС – 16 900,00 руб.

**Местонахождение Лотов:** г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54.

**Аукцион состоится 15.06.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по иуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

На што скардзімся?

# КАБ НАБЫВАЦЬ ТАВАР БЯСПЕЧНА,

## ці Як абараніць правы спажыўца

**У краіне на 11 % знізілася агульная колькасць зваротаў грамадзян, звязаных з парушэннем правоў спажыўцоў. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю, прааналізаваўшы звароты за 2020 год.**

Усяго МАРГам і мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі (выканкамамі) разгледжана 9707 зваротаў грамадзян (у 2019 годзе — 10 908), звязаных з парушэннем правоў спажыўцоў. Нягледзячы на некаторае зніжэнне агульнай колькасці зваротаў, адзначаецца павелічэнне колькасці скаргаў, разгледжаных МАРГам і выканкамамі Гродзенскай і Магілёўскай абласцей. Найбольшая ж колькасць зваротаў разгледжана Мінскім гарвыканкамам і адміністрацыямі раёнаў г. Мінска (39 % ад агульнай колькасці разгледжаных), выканкамамі Брэсцкай вобласці — 17 %, Магілёўскай — 12 %, Мінскай — 11 %, МАРГ — 10 %, астатнімі — менш за 8 %.

Структура зваротаў у галіне абароны правоў спажыўцоў на працягу апошніх некалькіх гадоў не мяняецца: звароты па пытаннях парушэння правоў спажыўцоў у сферы рознічнага гандлю, у тым ліку праз інтэрнэт-крамы, складаюць 34 % ад агульнай колькасці, па паслугах — 64 %, па іншых пытаннях — 2 %.

Па выніках разгляду пісьмовых і электронных зваротаў у дасудовым парадку спажыўцам кампенсаваны матэрыяльны ўрон на суму 813,23 тыс. рублёў (рост на 12 % да 2019 года); па нявырашаных у дасудовым парадку пытаннях выканкамамі было пададзена 175 іскаў у суд аб ахове правоў спажыўцоў (у 2019 годзе — 214 такіх іскавых заяў).

У мэтах аховы правоў спажыўцоў складзена 460 пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях, вынесена 283 прадпісанні аб спыненні парушэнняў правоў спажыўцоў. Для іх папярэджання вытворцам, прадаўцам, выканаўцам паслуг накіроўваліся рэкамендацыі, праводзілася растлумачальная работа.

У 2020 годзе ў МАРГ і выканкамы грамадзяне найбольш часта звярталіся па пытаннях, звязаных з набыццём тавараў неналежнай якасці, даваннем недакладнай інфармацыі пра тавары (у тым ліку на сайтах інтэрнэт-крамаў), немагчымасцю вяртання тавараў, набытых падчас правядзення прэзентацый і рэкламных акцый, павышэннем інтэрнэт-крамамі цэн на тавар пасля пацвярджэння заказу на куплю або адмовай у дастаўцы заказанага тавару па заяўленай у інтэрнэт-краме цане (г. зн. пасля заключэння дагавора куплі-продажу), парушэннем прадаўцамі інтэрнэт-крамаў устаноўленых заканадаўствам тэрмінаў вяртання грашовых сродкаў за тавар належнай або неналежнай якасці, недаванне спажыўцам права выбару формы аплаты (наяўная, безнаяўная) за заказаныя ў інтэрнэт-краме тавары, навязваннем спажыўцам «пашыранай» гарантыі пры набыцці тэхнічна складаных тавараў бытавога прызначэння, парушэннем тэрмінаў і парадку вяртання грашовых сродкаў у сувязі з адмовай (адменай) турыстычных тураў, немагчымасцю вяртання грошай за ўваходныя білеты на адмененыя культурна-відовішчныя мерапрыемствы і іншае.

Актуальнымі застаюцца звароты спажыўцоў, звязаныя з набыццём тавараў у сацыяльных сетках і ў групах, якія ствараюцца ў папулярных месенджарах. Спажыўцам неабходна ведаць, што ў гэтых выпадках адпраўшчыкамі тавараў, як правіла, з'яўляюцца фізічныя асобы, і на набыццё ў іх тавараў заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове правоў спажыўцоў не распаўсюджваецца. У такіх выпадках спрэчкі, якія ўзнікаюць, могуць вырашацца толькі ў судовым парадку.

Для павышэння прававой адукаванасці спажыўцоў праводзяцца кансультацыі па тэлефоне, падчас якіх спецыялісты аддзела па ахове правоў спажыўцоў тлумачаць грамадзянам іх правы, парадак дасудовага ўрэгулявання спрэчак з прадаўцамі (вытворцамі, выканаўцамі паслуг) і пытанні падачы іскавых заяў у суд. Часта такога кансультавання дастаткова для вырашэння спрэчнага пытання, якое ўзнікла паміж спажыўцом і прадаўцом, вытворцам ці выканаўцам паслугі.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

### РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества КУП «Миноблавтосервис» (Продавец)

**Лот № 1:** TOYOTA LAND-CRUISER 120, кузов (рама) № JTEBU29J005143808. Начальная цена с НДС – 41 237,62 руб. Местонахождение: г. Минск, ул. П. Бровки, 27.

**Аукцион состоится 14.06.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by, Минского областного исполнительного комитета minsk-region.gov.by, Организатора аукциона ino.by.

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

# Мясцовае Самакіраванне

14 мая 2021 г. № 18 (603)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ПАВАГА І ПАШАНА



Ветэран Вадзім СІНЯК і старшыня Камянюкскага сельскага Савета Сяргей БАГАЛЕЙША.

## НАШ «ЗАЛАТЫ ЗАПАС»

### З выездам на дом у сельсаветах са святам Перамогі павіншавалі ўдзельнікаў вайны

**Як і ў гарадах, у сельскай мясцовасці застаецца ўсё менш удзельнікаў Вялікай Айчыннай. У многіх сельсаветах ужо няма ніводнага ветэрана. Скажам, на ўвесь Брэсцкі раён такіх засталося толькі дзевяць... Аднак там, дзе яны яшчэ ёсць, мясцовыя ўлады акружылі іх клопатам і асаблівай увагай. У святочныя дні ўдзельнікі вайны прымалі гасцей з віншаваннямі і падарункамі.**

У Людвінове Драгічынскага раёна жыве адзіны ветэран вайны на ўвесь Папінскі сельсавет. Гэта ўдзельніца партызанскага руху Ніна Рыгораўна Рэпіха. Пра гады акупацыі яна заўсёды згадвае са слязамі: колькі перажылі, колькі нацярпеліся за той час. Яе бацьку забілі як вясковага актывіста. А маці з трыма дочкамі падалася ў партызанскі атрад, каб выратавацца. Пайшлі ў чым былі, прыхапіўшы невялікі вузельчык рэчаў. Уладкаваліся ў сямейны лагер. Ніну як меншую бралі з сабой разведчыкі — дарослы чалавек з падлеткам (а выглядала яна зусім як дзіця) выклікалі менш пытанняў у дарозе. Гэта пазней яна ўсвядоміла, што хадзіла кожны раз нібы па краёчку бездані...

Пасля вайны сям'і таксама прыйшлося нялёгка, але ж выстаялі, выжылі. Ніна выйшла замуж. З Васілём Аляксандравічам Рэпіхам, калгасным механізатарам, заўсёды жылі ў згодзе. Сёння ён, былы нястомны працаўнік, кавалер ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай Рэвалюцыі, цяжка хварэе, і жонка яму галоўная апора і падтрымка.

Са святам Перамогі Ніну Рыгораўну цёпла павіншавалі **старшыня сельскага Савета Святлана ДЫШКО і староста вёскі Марыя ПРАТАСЕВІЧ.** А праз дзень удзельнікі раённага аўтапрабегу, прысвечанага 76-й гадавіне Перамогі, прыпыніліся ў Людвінове. Яны перадалі Ніне Рэпісе віншаванне ад старшыні райвыканкама Аляксандра Дарашэнкі, уручылі каштоўны падарунак і прадуктовы набор.

Вадзім Рыгоравіч Сіняк з вёскі Каменюкі Камянецкага раёна ў сакавіку адсвяткаваў сваё 95-годдзе. Павіншаваць яго з юбілеем тады прыехала вялікая дэлегацыя: прадстаўнікі кіраўніцтва раёна, Нацыянальнага парка «Белавежская пушча», у якім той адпрацаваў шмат гадоў, мясцовай улады. Па просьбе гасцей ветэран згадаў сваё мінулае. На фронт Вадзіма прызвалі ў 1944 годзе адразу пасля вызвалення яго родных Пружан. Юнаку тады толькі споўнілася 18 гадоў. Ваяваў у пяхоце. Ён і цяпер без запінкі раскажа, якія гарады вызвалялі: у Польшчы — Торунь, Быдгашч, Гданьск. Потым фарсіравалі Одэр. Закончыў вайну пад нямецкім горадам Росток. «Страты неслі неймаверныя, — успамінаў былы салдат. — Дывізія ішла спачатку ў бок Берліна, потым нас павярнулі на поўнач, насустрач танкавай групоўцы. Каля 600 танкаў трэба было знішчыць, каб яны не сталі на шляху нашых наступальных часцей. Гэта вядома, работа артылерыстаў. Мы ў асноўным снарады падносілі. У пяхоце на перадавой складана выжыць, мала каму шанцавала, — працягваў франтавік. — Уяўляеце, я перажыў пяць папаўненняў! Ідзе ў бой рота — прыкладна 250 чалавек. Пасля бою ў страі застаецца 40—50 байцоў. Рота папаўняецца навічкамі. Зноў у бой, і зноў тая ж карціна. І так пяць разоў». Усё жыццё ён лічыў 9 Мая сваім галоўным святам.

Да гэтай пары Вадзім Рыгоравіч помніць дзень 9 мая 1945 года. «Нас паднялі ў чатыры гадзіны раніцы, думалі, па трывозе. А камандзір аб'явіў: перамога! Выскоквалі на вуліцу і палілі ўверх, нібы ашалелыя, колькі было патронаў».

*(Заканчэнне на 18-й стар.)*

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

## «Мы падзяляем ваш смутак...»

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА ад імя Савета Рэспублікі выказала спачуванні Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Валянціне МАЦВІЕНЦЫ ў сувязі з трагедыяй, якая адбылася ў адной са школ Казані.**

«Мы падзяляем смутак родных і блізкіх загінулых і жадаем ім мужнасці і стойкасці ў гэтую цяжкую гадзіну, а таксама перадаём пажаданні хутчэйшага выздараўлення ўсім пацярпелым», — гаворыцца ў пасланні.

У спачуванні выказана ўпэўненасць у тым, што тыя, хто здзейсніў гэтае бязлітаснае і жахлівае злачынства, панясуць заслужанае пакаранне.

## Дзеля пашырэння дыялогу

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА павіншавала Кахабера КУЧАВУ з абраннем старшынёй парламента Грузіі.**

«Спадзяюся, што ваша плённая дзейнасць на гэтай пасадзе будзе спрыяць пашырэнню дыялогу заканадаўчых органаў нашых краін, а таксама развіццю канструктыўнага супрацоўніцтва і рэалізацыі ўзаемавыгадных праектаў у інтарэсах двух народаў», — гаворыцца ў віншаванні.

## Эфектыўнае ўзаемадзеянне

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ прыняла ўдзел у пасяджэнні адміністрацыі Маскоўскага раёна Мінска.**

Былі падведзены вынікі дзейнасці ў асенне-зімовы перыяд 2020/2021 года, пастаўлены задачы па падрыхтоўцы раёна да будучага ацяпляльнага перыяду, разгледжаны і зацверджаны дэталёвы план адпаведных арганізацыйна-тэхнічных мерапрыемстваў.

На пасяджэнні дадаткова абмеркаваны шырокі спектр актуальных для Маскоўскага раёна пытанняў, якія датычацца сацыяльнай, будаўнічай і жыллёва-камунальнай сфер.

## Тэхналогіі выбарчага працэсу і маніторынгу выбараў

**Тэматычная навукова-практычная канферэнцыя адбылася ў Санкт-Пецярбургу. Удзел у ёй прыняў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.**

Навукова-практычную канферэнцыю «Тэхналогіі выбарчага працэсу і маніторынгу выбараў» прымеркавалі да 15-годдзя стварэння Міжнароднага інстытута маніторынгу развіцця дэмакратыі, парламентарызму і выканання выбарчых правоў грамадзян дзяржаў — удзельніц МПА СНД.

У рамках мерапрыемстваў міжнародная навукова-практычная канферэнцыі беларускі парламентарый выступіў на нарадзе «Інстытут міжнароднага назірання за выбарамі. Супрацьдзеянне замежнаму ўмяшанню ў выбарчыя працэсы» на тэму «Методыкі дзейнасці місій МПА СНД і БДІПЧ АБСЕ: параўнальны аналіз».

На канферэнцыі акцэнт быў зроблены на пытаннях выкарыстання інфармацыйных тэхналогій у выбарчым працэсе і разглядзе новых электаральных працэдур. Абмяркоўвалася таксама метадалогія выбарчага працэсу, прынцыпы і стандарты міжнароднага назірання за выбарамі ў сучасных умовах.

# АДЭКВАТНАЯ АДКАЗНАСЦЬ

## У крымінальны працэс уводзіцца медыяцыя, а грамадскія работы скасоўваюцца як від дадатковага пакарання

**На пасяджэнні чарговай сесіі Савета Рэспублікі сенатары адобрылі асноўныя новаўвядзенні, якія датычацца змянення кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці. У прыватнасці, карэкціруюцца тры кодэксы — Крымінальны, Крымінальна-працэсуальны і Крымінальна-выканаўчы.**

### З акцэнтам на лібералізацыю

Сутнасць змяненняў у законапраекты па крымінальнай адказнасці прадставіў **міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ.**

— З аднаго боку, ідзе лібералізацыя крымінальнай адказнасці, калі гэта датычыцца непаўналетніх. З іншага — узмацняецца адказнасць за тыя дзеянні, якія складаюць грамадскую небяспеку, звязаную з парушэннямі персанальных даных, заканадаўства аб масавых мерапрыемствах, з замахам на жыццё супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і іншых асоб, якія выконваюць грамадзянскія і службовыя абавязкі. Шэраг новаўвядзенняў з'явіцца ў сферы кібербяспекі, — растлумачыў ён сутнасць навел у размове з журналістамі.

> Крымінальны кодэкс дапоўнены саставамі, якія прадугледжваюць крымінальную адказнасць за экстрэмісцкую дзейнасць. Напрыклад, прапануецца крыміналізаваць садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці і праходжанне навучання ці іншай падрыхтоўкі для ўдзелу ў экстрэмісцкай дзейнасці.

Міністр паведаміў членам Савета Рэспублікі, прэзентуючы законапраект, што карэкціроўкі агульнай часткі Крымінальнага кодэкса ўключаюць у сябе пашырэнне пераліку ўчынкаў, з якіх вынікае крымінальная адказнасць па патрабаванні пацярпелага (арт. 33 КК); удасканаленне інстытута неабходнай абароны (арт. 34 КК); змяняюцца падыходы да пакарання за злоснае ўхіленне асуджаных ад пакарання, не звязанае з ізаляцыяй ад грамадства (арт. 49—52, 55 КК) з адначасовай дэкрыміналізацыяй артыкулаў 415—419 КК, а таксама выключэннем грамадскіх работ як дадатковага віду пакарання з прычыны невыкарыстання яго на практыцы.

Акрамя таго, унесены змяненні, якія даюць магчымасць растэрміноўкі і адтэрміноўкі аплаты штрафу (арт. 50 КК), перагляду правілаў залічэння тэрміну утрымання пад вартай і дамашняга арышту (арт. 75 КК), удасканалення інстытута выкарыстання прымусовых мер бяспекі і лячэння асоб, якія хварэюць на хранічны алкагалізм, наркаманію ці таксікаманію (арт. 107 КК).

У асаблівай частцы Крымінальнага кодэкса выключаюцца 10 артыкулаў ці 24 саставы злачынства, санкцыі па 70 саставах зменены, павялічана колькасць саставаў, у санкцыях якіх у якасці аднаго з відаў крымінальнага пакарання прадугледжваецца абмежаванне свабоды.

Асаблівую ўвагу пры падрыхтоўцы законапраекта яго распрацоўшчыкі аддалі лібералізацыі крымінальнага заканадаўства ў частцы прыцягнення да крымінальнай адказнасці непаўналетніх. Напрыклад, карэкціроўка артыкулаў 114 і 121 КК накіравана на рэалізацыю міжнародных стандартаў пры прызначэнні такога пакарання, як арышт непаўналетняга, а таксама абумоўлена лібералізацыяй падыходаў па пагашэнні судзімасці непаўналетняга.



Фота БелТА.

### Крымінальная адказнасць за дэманстрацыю свастыкі

У той жа час адказнасць і ўзмацняецца.

— З улікам грамадска-палітычнага становішча і падрыхтаваных у гэтай сувязі змяненняў заканадаўства ў сферы нацыянальнай бяспекі законапраектам прапануецца прадугледзець крымінальную адказнасць за шэраг супрацьпраўных дзеянняў, накіраваную на забеспячэнне аховы грамадскага парадку, — звярнуў увагу Алег Сліжэўскі.

У прыватнасці, уводзяцца новыя саставы злачынстваў, якія прадугледжваюць адказнасць за рэабілітацыю нацызму, паўторнае на працягу года распаўсюджванне забароненай інфармацыі на інтэрнэт-рэсурсах, незаконныя дзеянні ў адносінах да інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных даных, у тым ліку ў адносінах да асобы і яе сваякоў у сувязі з выкананнем службовай дзейнасці ці грамадзянскага абавязку. Да ліку новых саставаў адносяцца таксама неаднаразовая (больш за два разы) прапаганда ці публічнае дэманстраванне, выраб, распаўсюджванне нацысцкай сімволікі ці атрыбутыкі, неаднаразовае парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў.

Адзначым, што адказнасць у асобным артыкуле Крымінальнага кодэкса за дзеянні па рэабілітацыі нацызму была ўведзена па прапанове Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.

— Гэтае новаўвядзенне будзе спрыяць больш выразнаму і адназначнаму рэгуляванню грамадскіх адносін у сферы папярэджання і барацьбы з рэабілітацыяй нацызму, а таксама адыграе важную ролю ў захаванні гістарычнай памяці і недапушчэнні супрацьпраўнай дзейнасці, накіраванай на фальсіфікацыю гісторыі, — падкрэсліў **старшыня профільнай камісіі Сяргей СІВЕЦ.**

> Адказнасць у асобным артыкуле Крымінальнага кодэкса за дзеянні па рэабілітацыі нацызму была ўведзена па прапанове Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве.

### Тэрмін — за пагрозу і спецпадрыхтоўку

Адначасова законапраектам уносяцца змяненні ў шэраг дзеючых саставаў у частцы павелічэння тэрмінаў пакарання за злачынствы, звязаныя з арганізацыяй і падрыхтоўкай дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі спакой або актыўны ўдзел у іх. Напрыклад, узмацняюцца санкцыі артыкулаў «Забойства супрацоўніка ўнутраных спраў» (арт. 362), «Супраціўленне супрацоўніку ўнутраных спраў ці іншай асобе, якая ахоўвае грамадскі парадак» (арт. 363), «Гвалт або пагроза выкарыстання гвалту ў адносінах да супрацоўніка ўнутраных спраў» (арт. 364), «Гвалт або пагроза гвалтам у адносінах да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязацельствы, ці іншай асобы, якая выконвае грамадзянскі абавязак» (арт. 366).

Як паведаміў Сяргей Сівец, пастаяннай камісіяй быў падрыхтаваны шырокі пералік прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства праваахоўнага блока. Падрыхтаваныя ініцыятывы абмяркоўваліся з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі і былі імі падтрыманы, у тым ліку падчас нарад у Савеце Рэспублікі.

Старшыня профільнай камісіі звярнуў увагу калег-сенатараў на аптымізацыю асобных саставаў злачынстваў і іх санкцый з улікам актуальнага грамадска-палітычнага становішча.

— У прыватнасці, былі падтрыманы прапановы Савета Рэспублікі аб узмацненні адказнасці за паклёп у дачыненні да кіраўніка дзяржавы; абразу кіраўніка дзяржавы, а таксама прадстаўніка ўлады; наўмыснае блакіраванне транспартных камунікацый; публічныя заклікі да арганізацыі або правядзення незаконных масавых мерапрыемстваў або ўцягванне асоб ва ўдзел у такіх масавых мерапрыемствах; арганізацыю і падрыхтоўку дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх; дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь; знявагу дзяржаўных сімвалаў і іншыя правапарушэнні, — растлумачыў ён.

Крымінальны кодэкс дапоўнены саставамі, якія прадугледжваюць крымінальную адказнасць за экстрэмісцкую дзейнасць. Напрыклад, прапануецца крыміналізаваць садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці і праходжанне навучання ці іншай падрыхтоўкі для ўдзелу ў экстрэмісцкай дзейнасці.

### За нявыплату падаткаў — ад 7 да 12-і

Міністр юстыцыі расказаў, што законапраект прадугледжвае і ўдасканаленне крымінальнага заканадаўства ў супрацьдзеянні злачынствам у сферы эканамічнай дзейнасці і камп'ютарнай бяспекі.

Так, артыкул 243 КК выкладаецца ў новай рэдакцыі, якая прадугледжвае павелічэнне санкцыі за ўхіленне ад выплаты падаткаў, збораў шляхам утойвання, наўмыснага заніжэння падатковай базы, ухілення ад прадстаўлення падатковай дэкларацыі (разліку) ці ўнясення ў яе наўмысна ілжывых звестак, якія нанеслі шкоду ў асабліва буйным памеры, — з сямі да дванаццаці гадоў.

Што датычыцца ўдасканалення Крымінальна-працэсуальнага кодэкса, міністр юстыцыі спыніўся на некалькіх момантах.

Так, прапануецца ўвесці інстытут медыяцыі ў крымінальны працэс і дапоўніць КПК паняццямі «медыяцыя», «медыяцыйнае пагадненне», «медыятар», а таксама асобным артыкулам вызначыць парадак прымірэння абвінавачанага з пацярпелым.

Прапануецца таксама ўдасканаленне інстытута абскарджання дзеянняў і рашэнняў органа, што вядзе крымінальны працэс. У законапраекце замацаваны падыход, паводле якога далейшае абскарджанне рашэнняў, з якімі не пагадзіўся пракурор, магчымае праз вышэйшага пракурора і вышэйшы суд.

### Засцярога ад унутраных і вонкавых пагроз

Наконт карэкціровак у Крымінальна-выканаўчы кодэкс — яны абумоўлены рэалізацыяй падыходаў, што вынікаюць з новаўвядзенняў, прапанаваных у крымінальным і крымінальна-працэсуальным законах. Такім чынам, перакананы Алег Сліжэўскі, законапраектам прадугледжана комплексная рэгламентацыя шырокага кола пытанняў, якія маюць важнае значэнне для грамадства і дзяржавы.

У сваю чаргу, Сяргей Сівец выказаў упэўненасць, што прыняцце адпаведнага закона будзе садзейнічаць умацаванню правапарадку ў грамадстве:

— Закон адыграе важную ролю ў папярэджанні здзяйснення злачынстваў, а таксама ўзмоцніць абароненасць грамадзян і дзяржавы ад розных пагроз унутранага і знешняга характару, — падкрэсліў старшыня профільнай камісіі і рэкамендаваў сенатарам ухваліць законапраект, з чым яны і пагадзіліся.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# Мультыплікатар у кадры

**У аўторак, 18 мая, 75-ы год нараджэння адзначыць заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, рэжысёр, мультыплікатар, кампазітар гульнявых і мультыплікацыйных фільмаў Ігар Воўчак. У гэты дзень у эфіры «Беларусь 3» выйдзе чарговы выпуск праграмы «Кадры жыцця», які будзе прысвечаны майстру.**



Калі звярнуцца да біяграфіі Ігара Віктаравіча, то стане зразумела, што ў кінамастацтва ён трапіў не адразу, бо спачатку была вучоба ў кансерваторыі. Неяк у працэсе работы над музыкай для фільма «Хлопчык і птушка» яго вельмі ўразіла мультыплікацыя, і да будучага рэжысёра прыйшло разуменне, што менавіта там ён хоча рэалізоўвацца, ствараць. Ігар Воўчак вырашае атрымаць дадатковую адукацыю, і з 1979 да 1981 год вучыцца на Вышэйшых рэжысёрскіх курсах пры «Дзяржкіно», а пасля пачынае працаваць рэжысёрам-мультыплікатарам на «Беларусьфільме». Цяпер на творчым рахунку майстра тры дзясяткі мультфільмаў, сярод якіх «Як ліса ваўка судзіла», «Скерца», цыкл «Несцерка» ў некалькіх частках, «Цуды на дзень нараджэння», «Ваўчышка» і многія іншыя. Акрамя гэтага, Ігар Воўчак напісаў музыку больш чым да 40 фільмаў (гульнявыя, дакументальныя, мультыплікацыйныя). Як падзяліўся рэжысёр, яго заўсёды перш за ўсё цікавіў чалавек, што і знайшло адлюстраванне ў яго работах. А падчас прагляду праграмы «Кадры жыцця» гледачы змогуць больш даведацца пра асобу самога творцы.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

**Выпуск № 120**

Сваю задачу прапануе вядучы шахматнага клуба «Звязды» ***(гл. дыяграму)***.



**Белыя:** Крg4, Фh1, пп. e6, f5, h3 (5).
**Чорныя:** Крf6, пп. e5, e7, f7, g7 (5).
Мат за 2 хады.

*Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru*

* * *

У Екацярынбургу завяршыўся турнір прэтэндэнтаў на сусветную карону. Першы этап адбыўся ў сакавіку 2020 года, пасля чаго турнір быў спынены з-за пандэміі. І вось праз год 8 гросмайстраў правялі другі этап. Перамог Ян Няпомнячшы (Расія) — 8,5 бала з 14. На наступных месцах: 2-е — Максім Ваш'е-Лаграў (Францыя) — 8; 3–4-е — Аніш Гіры (Нідэрланды) і Фабіяна Каруана (ЗША) — па 7,5; 5–6-е — Дзін Ліжэнь (Кітай) і Аляксанлр Грышчук (Расія) — па 7; 7-е — Кірыл Аляксеенка (Расія) — 5,5; 8-е — Ван Хаа (Кітай) — 5. Такім чынам, матч на першынство свету з Магнусам Карлсенам (Нарвегія) згуляе Ян Няпомняшчы. Цікава, што пасля першага этапу лідзіраваў таксама ён, праўда, нароўні з М. Ваш'е-Лагравам.

* * *

Сёлетнія чэмпіянаты Беларусі сярод юніёраў (да 20 гадоў) сабралі па 8 юнакоў і дзяўчат. У юнацкім турніры выступалі ў тым ліку адзін міжнародны майстар і пяць майстраў ФІДЭ. Перамог Дзяніс Лазавік — 5 балаў з 7 магчымых. На другім месцы — Максім Царук (4,5), на трэцім — Вячаслаў Зарубіцкі (4,5), на чацвёртым — Арцём Сіняўскі (4). Сярод удзельніц дзявочага турніру было два майстры ФІДЭ. Упэўнена перамагла Аляксандра Тарасенка, якая выйграла шэсць партый пры адной нічыёй. «Серабро» ў Ксеніі Норман — 5,5 бала, «бронза» — у Ксеніі Зелянцовай (4,5), а чацвёртае месца заняла Караліна Галоўчыц (4).

Вось як гулялі юніёры-чэмпіёны.

Дзяніс Лазавік — Вячаслаў Зарубіцкі. 1. d4 d5 2. c4 c6 3. Кf3 Кf6 4. e3 e6 5. b3 Кbd7 6. Сb2 Сd6 7. Сd3 0-0 8. 0-0 b6 9. Кc3 Сb7 10. Фc2 Ле8 11. e4 dc 12. С:c4 b5 13. Се2 e5 14. de К:e5 15. Лad1 Фc7 16. g3 a6 17. Кh4 g6 18. Кg2 Лad8 19. f4 Кeg4 20. Сf3 Сc5+ 21. Крh1 Фb6 22. e5 Кf2+ 23. Л:f2 С:f2 24. ef Л:d1+ 25. К:d1 Сd4 26. С:d4 Ф:d4 27. h4 Ф:f6 28. Кf2 h5 29. Крh2 Сc8 30. Кe4 Фe6 31. Фc3 Лd8 32. Кe3 b4 33. Ф:b4 Лd3 34. Фc5 f5 35. Кg5 Ф:e3 36. Ф:c6 Крg7 37. Ф:c8 Фe7 38. Сg2 a5 39. Фc4 Фd7 40. Кe6+, 1:0.

Аляксандра Тарасенка — Марына Хоміч. 1. e4 c6 2. c4 d5 3. ed cd 4. cd Кf6 5. Сb5+ Кbd7 6. Кc3 a6 7. С:d7+ Ф:d7 8. Кf3 К:d5 9. 0-0 g6 10. Кe5 К:c3 11. bc Фc7 12. Фa4+ Сd7 13. Фf4 0-0-0 14. d4 Сg7 15. Ле1 Сe8 16. Фg4+ e6 17. Сf4 h5 18. Фh4 Лh6 19. К:g6 Сf6 20. Ф:f6 Л:g6 21. С:c7 Л:f6 22. С:d8 Кр:d8 23. Ле5 h4 24. Лae1 Сc6 25. g3 Сd5 26. a3 Лf3 27. Л1e3 hg 28. Л:d5+, 1:0.

* * *

Міхаіл Нікіценка выйграў чарговы турнір у сербскім Нові-Садзе (21 удзельнік), набраўшы 7,5 бала з 9 магчымых. Сяргей Жыгалка заняў 13-е месца ў анлайн-турніры па бліцы на сайце chess.com (644 удзельнікі), а таксама згуляў праз інтэрнэт матч па бліцы з гросмайстрам Аляксандрам Інджычам (7:13). Вольга Бадэлька выступіла ў спаборніцтве, дзе чэмпіён свету Магнус Карлсен анлайн гуляў бліц супраць 22 маладых шахматыстаў. На жаль, Вольга прайграла. Увогуле ж М. Карлсен выйграў 19 партый, дзве прайграў, адну звёў унічыю.

У Мінску прайшлі першынствы краіны сярод самых юных шахматыстаў. У групе да 8 гадоў перамаглі Дамір Булгак і Насця Савасцянчук, да 10 гадоў — Мікіта Новікаў і Варвара Мацкевіч.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Са6! Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Сяргей Дарошчанка, Васіль Жуковіч, Сяргей Цяльпук, Васіль Барысевіч, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Вандроўкі з розным ухілам

**Калі абставіны ўносяць карэктывы ў ваша жыццё і планы, то замест таго, каб засмучацца, лепш падумаць, як выкарыстаць сітуацыю на сваю карысць. Вось, напрыклад, вандроўкі — гэта для многіх з нас магчымасць здабываць новыя ўражанні, веды і паралельна адпачываць. Але, калі планы на будучы водпуск пакуль пад пытаннем, то можна падарожнічаць, не выходзячы з дому. І адна з такіх магчымасцяў — прагляд тэлевізійных праектаў, якія распавядаюць пра новыя мясціны, адкрываюць нязведанае і даюць падказкі для будучых маршрутаў. Распавядаем пра тры праграмы, на якія варта звярнуць увагу аматарам падарожжаў.**



На тэлеканале АНТ з'явіўся праект **«Раніца за вечар мудрэйшая»**. Ён, як адзначаюць стваральнікі, будзе цікавы для многіх, асабліва для тых, хто шукае адказы на пытанні «як гэта працуе?» і «дзе гэта знаходзіцца?». У тэлеаўдыторыі цяпер ёсць магчымасць не толькі даведацца нешта, што іх даўно цікавіць, але і зрабіць гэта ў кампаніі вядучых праграмы — дзяўчынкі Міланы і яе дзядулі. Яны, дарэчы людзі многім вядомыя... Васьмігадовая Мілана Хатулёва з Віцебска была ўдзельніцай тэлепраекта «Талент краіны — 3» у 2018 годзе, дзе заявіла пра сябе ў арыгінальным жанры дэкламацыі і перамагла, а акцёр Уладзімір Варанкоў наогул у рэкамендацыі не мае патрэбы, але самыя маленькія могуць пазнаць яго па голасе мядзведзіка Топы з «Калыханкі». І вось цяпер гэты дуэт вядучых, узброіўшыся камерай і пісьмамі гледачоў, штосуботу накіроўваецца ў вандроўкі па краіне, шукае адказы на самыя неверагодныя пытанні. У выніку тэлеаўдыторыя адкрывае для сябе шмат цікавых старонак з гісторыі і сучаснасці Беларусі, дзе чакае знаёмства з выдатнымі людзьмі, геніяльнымі вынаходніцтвамі, важнымі дасягненнямі, містычнымі гісторыямі і легендамі, сакрэтамі вытворчасці і многае іншае. Папярэднія выпускі, калі прапусцілі, можна знайсці ў сеціве, а новыя глядзіце па суботах у 10.25.

Не менш цікавая і пазнавальная турыстычная праграма **«Маршрут пабудаваны»** на тэлеканале «Беларусь 1». Яна дае магчымасць разам з вядучымі Марыяй Багатыр і Антонам Бяляўскім апынуцца ў самых цікавых кутках Беларусі і можа стаць сапраўдным «навігатарам» для прыхільнікаў падарожнічаць незалежна ад фінансавых магчымасцяў. Праект — гэта своеасаблівая тэлевізійная экскурсія, дзе гледачы разам са здымачнай групай адкрываюць неверагодныя мясціны нашай краіны. Ужо атрымалі сваю порцыю ўвагі Бабруйск, Заслаўль, Слуцк, Маладзечна і многія іншыя гарады. Але ж колькі яшчэ населеных пунктаў на карце! Таму наперадзе нас чакаюць новыя гісторыі і незвычайныя маршруты. Не прапусціце чарговы выпуск праграмы «Маршрут пабудаваны» ў пятніцу ў 17.30.




Калі ж вас больш цікавяць замежныя вандроўкі, то можна звярнуцца да варыянту, які ў многіх з нас на слыху. Так, я пра трэвэл-шоу **«Арол і рэшка»**, якое транслююць у эфіры канала «Беларусь 2». У нядзелю 16 мая ў 20.10 тут распачнецца «Марскі сезон — 3», дзе тэлегледачоў чакаюць вандроўкі па самых прыгожых курортах.



Вядучыя праекта Мікалай Сярга і Аліна Астроўская працягнуць знаёміць аўдыторыю не толькі з найлепшымі пляжнымі мясцінамі Зямлі, але і з малавядомымі куточкамі мацерыкоў, куды яшчэ не дабраліся бізнесмены і сеткавыя гатэлі. Разам са стваральнікамі праекта мы пазнаёмімся з дваццаццю прыгожымі пунктамі свету, дзе разліліся моры і акіяны. А вось тое, па якім сцэнарыі пройдзе адпачынак кожнага з вядучых — гэта традыцыйна вызначыць манетка. Адзін атрымае неабмежаваныя магчымасці з «залатой» карткай, а іншаму трэба будзе пражыць у незнаёмым месцы на бюджэт у сто долараў. Аднак пры любым раскладзе ўсе застануцца з багажом новых уражанняў і адкрыццяў.

**Алена ДРАПКО.**

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Вяртанне» (16+).**
**13.05, 15.25 Меладрама «Заходзьце, закрыта!» (12+)**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.15** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**23.55** Арэна.
**0.35** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 19.30** Тэлебарометр.
**9.05, 20.00** «Зразумець. Даравать» (16+).
**9.40, 20.35** «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
**10.25** «Камень, нажніцы, папера» (16+).
**10.55** «На тыдзень» (16+).
**11.45** «Да пабачэння» (16+).
**12.35 Сага «Зорныя войны: Эпізод VII — Абуджэнне сілы» (12+).**
**14.55** М/ф «Ральф» (12+).
**16.30** М/с «Цімон і Пумба» (0+).
**17.00** «Суперлато».
**17.40** «Арол і рэшка-3» (16+).
**18.40** «Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**21.20** «Тата папаў» (16+).
**23.50** Хачу ў тэлевізар!
**23.55 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Пупы па-засцепску.
**8.05, 12.00, 20.20, 23.35** Навіны культуры.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.15** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**9.40, 16.00 «Бераг». Маст. фільм (12+).**
**12.20** «Беларуская кухня». Вантрабянка.
**12.45** «Наперад у мінулае».
**13.15, 21.05** «Вялікая вайна». Дак. драма (12+).
**14.05, 21.55 «Дзяўчынка шукае бацьку». Маст. фільм (6+) [СЦ].**
**15.35** «Навукаманія» (6+).
**18.20** В. Дранько-Майсюк. «Пясняр». Музычны спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага.
**20.40** «Калыханка» (0+).

### Беларусь 5

**7.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі.
**8.45** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Агляд.
**9.30** Вынікі тыдня.
**10.15** Валейбол. Кваліфікацыя да ЧЕ-2021. Мужчыны. Беларусь — Нарвегія.
**12.00** Вялікі спорт.
**12.45** Тэніс. ВТА.
**14.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Вэст Бромвіч — Ліверпуль.
**16.50** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. 1/4 фіналу. БЧ (Гомель) — «Дарожнік» (Мінскі р-н). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**18.50** Спорт-цэнтр.
**19.00** Чэмпіянат Еўропы па водных відах спорту. Плаванне.
**20.40** На грані фолу. Футбольны агляд.
**22.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.05** Веславанне на байдарках і каноэ. Кубак свету.

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.00** Нашы навіны.
**9.10** «Контуры».
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15 Серыял «Медсястра» (12+).**
**15.10** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 23.20** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** Удача ў прыдачу! Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10 «Нішто не здараецца двойчы». Серыял (16+).**
**22.20 Серыял «Гурзуф» (16+).**

### СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40, 0.10** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**11.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.35, 20.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.35, 16.50 «Геній». Серыял (12+).**
**18.30** Ток-шоу «Па сутнасці».
**20.15, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.20** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.30** «Міншчына».
**21.25** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**1.00** «Самая карысная праграма» (16+).
**1.55** «Мінтранс» (16+).

### МІР

**5.00, 10.10 Серыял «Тальянка» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 17.20** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.20** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**18.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25, 20.10** «Гульня ў кіно» (12+).
**21.00, 21.55** «Назад у будучыню» (16+).
**22.55** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**23.30, 0.10 Серыял «Без следу» [СЦ] (16+).**
**2.35** «Свет пераможцаў» (16+).
**3.00 Серыял «На прыцэле». 1—3-я серыі (16+).**

### РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Таямніцы Беларусі» (16+).
**12.30** «Спецыяльны рэпартаж».
**12.50** «У людзях».
**13.35** «Плюс-мінус».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Рая ведае ўсё!» (12+)**
**17.15** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Нягледзячы ні на што» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.15** Беларусы (6+).
**6.55** «Урачэбныя таямніцы плюс» (12+).
**7.35** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20, 10.20, 10.50 Дэтэктыў «Пацалунак Сакрата». Фільм «Смяротны водар» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55 Серыял «Ліцейны» (16+).**
**14.55** «Чакай мяне» (12+).
**16.20, 19.35, 21.55, 23.25** Сёння. Галоўнае.
**16.25** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «ДНК» (16+).
**18.00 Дэтэктыў «Пёс» (16+).**
**19.50 Серыял «Капкан для монстра» (16+).**
**22.00** «НЗ.by».
**22.15 Серыял «За гадзіну да світання» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.30, 17.30, 21.00, 0.25** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 15.40** «Мультпарад». «Шчанячы патруль» (0+).
**7.30** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Бывае і горш» (16+).**
**8.15 Серыял «Камісар Рэкс» (12+).**
**9.40** Дак. фільм «Аляксандр Чыжэўскі. Запалонены сонцам» (12+).
**10.25** Прыгоды «Смерць на Ніле» (12+).
**12.45 Серыял «Лейтэнант Каломба» (12+).**
**14.00 Серыял «Чыста англійскія забойствы» (12+).**
**15.35, 20.45 Серыял «Хачу ў Парыж» (6+).**
**16.35 Серыял «Вербная нядзеля» (16+).**
**17.35 Серыял «Апошні артыкул журналіста» (16+).**
**19.20 Серыял «Грэшніца» (16+).**
— Адвакатура — гэта ў першую чаргу сацыяльны інстытут дзяржавы, які забяспечвае рэалізацыю канстытуцыйнага права грамадзян на кваліфікаваную юрыдычную дапамогу. Аказанне адвакатамі на прафесійнай аснове розных відаў юрыдычнай дапамогі грамадзянам і іншым суб'ектам, у тым ліку на бязвыплатнай аснове, мае асаблівае значэнне для эфектыўнай аховы іх правоў і законных інтарэсаў, — падкрэсліў старшыня профільнай камісіі. — У той жа час падзеі апошняга часу паказалі, што асобныя адвакаты выкарыстоўвалі дадзеныя прававы інстытут выключна ў дэструктыўных мэтах, у тым ліку для задавальнення ўласных палітычных амбіцый і самапіяру з парушэннем нормаў і палажэнняў карпаратыўнай этыкі і нанясеннем істотнай шкоды заслужанай дзелавой рэпутацыі як рэспубліканскай, так і абласным калегіям адвакатаў.

Таму, каб забяспечыць эфектыўны кантроль дзяржавы за дзейнасцю адвакатаў, якасцю і правамернасцю аказаных імі юрыдычных паслуг, устанаўліваецца адзіная форма арганізацыі іх дзейнасці — юрыдычныя кансультацыі.

Таксама Міністэрства юстыцыі атрымлівае права ажыццяўляць кантроль за выкананнем адвакатамі заканадаўства аб адвакатуры і ліцэнзаванні і правілаў прафесійнай этыкі адвакатаў, а таксама ўплываць на фарміраванне органаў адвакацкага самакіравання.

Адной з навацый закона з'яўляецца забеспячэнне даступнай кваліфікаванай юрыдычнай дапамогі для найбольш уразлівых катэгорый грамадзян. У прыватнасці, пашыраецца кола асоб, якім юрыдычная дапамога будзе аказвацца за кошт сродкаў калегій адвакатаў (гэта асобныя катэгорыі пенсіянераў і інвалідаў, непаўналетнія, цяжарныя жанчыны, шматдзетныя бацькі).

— Такім чынам, пералічаныя навацыі дазволяць узмацніць ролю дзяржавы ў забеспячэнні дзейнасці адвакатуры і пры гэтым стварыць належныя ўмовы па аказанні якаснай і даступнай юрыдычнай дапамогі насельніцтву і суб'ектам гаспадарання, — падкрэсліў Сяргей Сівец.

З яго доказамі калегі-сенатары пагадзіліся і ўхвалілі законапраект.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

### Наша даведка

**Па стане на 1 мая 2021 года ў складзе тэрытарыяльных калегій адвакацкую дзейнасць ажыццяўляюць 2007 адвакатаў. Сярод іх у складзе 161 юрыдычнай кансультацыі — 1248 адвакатаў; у складзе 97 адвакацкіх бюро — 366 адвакатаў; індывідуальна — 393 адвакаты.**

# І закружыцца ў вальсе Перамогі

**У флэшмобе «Вальс Перамогі», які прайшоў у Магілёве каля Дома ветэранаў, узялі ўдзел маладыя спецыялісты сфер культуры і адукацыі горада, актыў абласнога і гарадскога ГА «БРСМ», навучэнцы розных устаноў. Яны падрыхтавалі тэматычнае віншаванне для ветэранаў, выканалі песні ваенных гадоў, уручылі памятныя падарункі.**



**Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Фёдар КРЫВАНОГАЎ.**

— Магілёўскі Дом ветэранаў дорыць свaім жыхарам галоўнае, у чым мае патрэбу кожны пажылы чалавек, — утульнасць і ўвагу. Цяпер у нас жывуць восем ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, — удакладняе **дырэктар Дома ветэранаў Наталля БАНЬКОЎСКАЯ.** — Дзень Перамогі — самае дарагое для іх свята. Яны заўсёды чакаюць яго з асаблівым хваляваннем, рыхтуюцца. А як яны рады гасцям! Ні адзін ветэран не застаецца без падарункаў і ўвагі кіраўніцтва горада. Іх наведваюць таксама і валанцёры. На жаль, сёння толькі некаторыя ветэраны прысутнічаюць на вуліцы на канцэрце, астатнія назіраюць са свайго акна (з-за праблем са здароўем). Традыцыйна да акцыі далучыліся жыхары нашага мікрараёна.

Дарэчы, некалькі дзясяткаў віншавальных паштовак і іншых падарункаў для ветэранаў да Дня Перамогі падрыхтавалі навучэнцы Магілёўскага медыцынскага каледжа. Свае работы «з душой» яны ўручылі падчас флэшмоба «Вальс Перамогі». Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Фёдар Крываногаў — адзін з тых, хто прымаў ад іх віншаванні. Фёдару Іванавічу споўнілася 96. Доўгачаканую перамогу ён сустрэў у Польшчы, быў стралком-радыстам. За мужнасць на вайне ўзнагароджаны медалямі «За перамогу над Германіяй», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна», «За баявыя заслугі». Мае таксама ордэн Вялікай Айчыннай вайны II ступені.

— Дзень Перамогі — гэта радаснае, асаблівае свята са слязамі на вачах. Хай нашы дзеці і ўнукі жывуць пад мірным небам, ніколі не зазнаюць тых жахаў вайны, якія мы перажылі, — пажадаў шаноўны ветэран і дадаў, што падзеі тых гадоў згуртавалі людзей з абсалютна рознымі лёсамі, у якіх была адзіная мэта — мірнае жыццё.

**Таццяна МАЛІНІНА. Фота аўтара.**

# НАШ «ЗАЛАТЫ ЗАПАС»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Вадзіму Сіняку пасля гэтага давялося служыць яшчэ чатыры гады. Потым вярнуўся дадому, скончыў інстытут. Усё жыццё працаваў у лясной гаспадарцы. Прырода надзяліла гэтага чалавека цудоўнай памяццю, дасціпным розумам. Вось і сёлета на 9 Мая ён выступаў на мітынгу каля помніка ў Каменюках і гаварыў пра важнасць захавання міру на нашай зямлі.

Дома ветэрана наведалі **старшыня сельскага Савета Сяргей БАГАЛЕЙША і намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» Ніна БОГУШ** з віншаваннямі і падарункамі.

У Брэсцкім раёне ўдзельнікаў вайны віншавалі разам з духавым аркестрам адной з вайсковых часцей Брэстчыны. Прыязджалі да ветэрана дадому, і прама на вуліцы аркестр іграў «Дзень Перамогі», і іншыя знаёмыя мелодыі. Збіраліся сваякі шаноўнага чалавека, падыходзілі суседзі, знаёмыя. Такім чынам віншаванне аказалася асабліва ўрачыстым. У Чарнаўчыцкім сельсавеце, як сказала Святлана Мядзведзь, што выконвае тут абавязкі старшыні, ушанавалі трох ветэранаў: франтавікоў Аляксандра Аляксеевіча Жука, Івана Канстанцінавіча Міхальцова і працаўніка тылу Аляксандру Міхайлаўну Павярынаву.

Ва ўмовах пандэміі ўлічылі пажаданне кожнага ветэрана па форме ўшанавання. Напрыклад, Аляксандра Павярынава прымала віншаванні з балкона другога паверха. Ну а мужчыны выйшлі асабіста паціснуць рукі старшыні райсавета Уладзіміру Хвацiку ды іншым гасцям.



**Ніну РЭПІХУ віншуе стараста вёскі Марыя ПРАТАСЕВІЧ.**

З прычыны ўзросту і стану здароўя многія ветэраны перабраліся да дзяцей. Пра іх таксама не забыліся ў родных вёсках. Скажам, Леанід Васілевіч Вакула з Роўбіцка Пружанскага раёна цяпер жыве ў Мінску. Яго па тэлефоне цёпла павіншаваў старшыня Сухопальскага сельскага Савета Міхаіл Мартынаў і запрасіў сваякоў заехаць па падарунак для ветэрана.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# АДНАЎЛЕННЕ ГАРАДСКІХ АРТЭРЫЙ

## Электрычнага пасажырскага транспарту на Віцебшчыне стане больш на траціну

**На пазачарговай трыццаць першай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў зацвердзілі на пяцігодку комплекс рэгіянальных мерапрыемстваў па рэалізацыі дзяржаўных праграм «Дарогі Беларусі» і «Транспартны комплекс». Безумоўна, гэтыя тэмы датычацца і ўсіх жыхароў поўначы краіны, і тых, хто праязджае Віцебшчыну, бывае тут па розных справах.**

**Намеснік старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр ХРЫСТАФОРАЎ** нагадаў, што дарожнае пытанне разглядалася нядаўна на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама, на якім прысутнічаў міністр транспарту і камунікацый Аляксей Аўраменка.

Увага дарогам Падзвінскага краю неабходная яшчэ і таму, што пасля Міншчыны ён на другім месцы па агульным кіламетражы. Тут 15 тысяч кіламетраў дарог — усяго на 1,1 тысячу кіламетраў менш, чым у сталічным рэгіёне.

**Старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр ШЫДЛОЎСКІ** агучыў народным выбраннікам статыстыку таго, што неабходна будзе зрабіць за пяцігодку.

У прыватнасці, у 2021—2025 гадах плануецца адрамантаваць каля 1,3 тысячы кіламетраў мясцовых аўтамабільных дарог, з іх па новых тэхналогіях — не менш за 25 кіламетраў. Безумоўна, аўтамабілістам хацелася б, каб гэты паказчык быў большы, ды і дарожнікам, напэўна, таксама. Зразумела, што новыя пакрыцці — гарантыя таго, што менш будзе праблем з эксплуатацыяй трас, параўнальна пазней спатрэбіцца рамонт, улічваючы больш адаптаванасць да ўласцівых для Віцебшчыны перападаў тэмператур і вільготнасці.

Што датычыцца матэрыялаў для рамонту, будзе праведзена рэвізія мясцовых заводаў па вырабе асфальту, а яны ёсць у кожным раёне. У гэтым пытанні цяжка спрачацца з прыведзенай аргументацыяй: няхай лепш у будучыні працуюць не ўсе такія вытворчасці, а толькі тыя, дзе найбольшы каэфіцыент карыснага дзеяння.

У Аршанскім раёне сёлета плануюць здаць у эксплуатацыю завод з самым перадавым абсталяваннем, які будзе вырабляць прадукцыі ў разы больш, чым яго «сабраты», пабудаваныя даўно.

Вопыт запуску эфектыўнага асфальтабетоннага завода ў Падзвінні ёсць. У 2015 годзе ў Віцебску запрацаваў такі першынец у галіне. Гонарам аднаго з дарожнабудаўнічых трэстаў стала нямецкая ўстаноўка, якая знаходзіцца ў кантэйнеры. Яе магутнасць — 240 тон у гадзіну. На ёй можна выраблаць класічнае асфальтавае пакрыццё і сучаснае. Арганізацыя вытворчасці абышлася ў суму, большую за 2 мільёны еўра. Неабходныя грошы ўзялі ў крэдыт. Акупіцца трата, згодна з бізнес-планам, на працягу пяці гадоў. Цікава, што гэты завод літаральна за пару тыдняў магчыма зрабіць мабільным і перавезці, куды трэба. Што важна, шкода для навакольнага асяроддзя мінімальная.

Аршанскі завод, як падкрэсліў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ**, будзе адным з найлепшых не толькі на тэрыторыі Беларусі.

На сесіі таксама было агучана, што ў 2021—2025 гадах прадугледжаны ўвядзенне і рэканструкцыя васьмі дарожных збудаванняў (масты, пуцеправоды, эстакады і іншыя) працягласцю 141 пагонны метр.

Таксама Віцебскім абласным Саветам дэпутатаў было прынята рашэнне «Аб зацвярджэнні рэгіянальнага комплексу мерапрыемстваў па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы «Транспартны комплекс» на 2021—2025 гады».

Чакаецца, што па вобласці пасажыраабарот аўтамабільнага, гарадскога электрычнага транспарту складзе 107,7 % да ўзроўню 2020 года, грузаабарот аўтатранспарту — 122,2 %, экспарт транспартных паслуг па аўтамабільных перавозках грузаў і пасажыраў — 125 %.

Доля электрыфікаваных транспартных сродкаў, якія ажыццяўляюць гарадскія перавозкі пасажыраў, да канца пяцігодкі складзе не менш за 30 %.

Ужо становіцца традыцыяй, што пры здачы новых праспектаў або капітальным рамонце і рэканструкцыі раней існуючых «гарадскіх артэрый» там абавязкова прадугледжваецца рух электробусаў або тралейбусаў. І пасажыры, напрыклад, у Віцебску пры аднолькавым кошце праезду на ўсе віды транспарту ўсё часцей выбіраюць «электрычны аўтобус». У такіх машынах прыемна праехацца пры любым надвор'і, бо ў салоне прадумана ўсё да дробязяў.

На працягу пяцігодкі ў Віцебскай вобласці запланавана набыць пяць электробусаў, восем тралейбусаў, 77 аўтобусаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНІКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 13 мая 2021 года.

# ЖАНЧЫНЫ, НЕБА, ВАЙНА...

**У Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова адкрылася незвычайная выстава «Мы пакаралі неба». Яна прысвячаецца лётчыцам, Героям Савецкага Саюза, якія бралі ўдзел у вызваленні Беларусі.**

Можна ўбачыць іх фотаздымкі, копіі дакументаў, кнігі пра тых, хто на нябёсах здабываў Перамогу. Цікава, што адна з адважных лётчыц жыла літаральна насупраць музея. І гэты нюанс таксама стаў падставай для падрыхтоўкі унікальнага праекта.

Паводле слоў **кіраўніцы ўстановы культуры Ірыны ШЫШКОВАЙ**, у музеі напярэдадні святкавання Дня Перамогі па традыцыі новыя выставы, і вось чарговая.



На адкрыцці выставы.

Больш за 500 тысяч савецкіх жанчын падчас той жудаснай вайны ваявалі на франтах, у партызанскіх атрадах і падполлі, былі ў канцлагерах... 15 мільёнаў прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва працавалі ў тыле, расказала дырэктар музея.

На адкрыццё запрасілі былых малалетніх вязняў фашысцкіх канцлагераў, прадстаўнікоў ветэранскай арганізацыі.

**Галоўны захавальнік фондаў музея Дзяніс ЯКАЎЛЕЎ** расказаў пра тое, што ваявалі лётчыцы зусім маладымі. А ўсё пачалося з загада народнага камісара абароны СССР № 99 за подпісам І. Сталіна (ад 8 кастрычніка 1941 года). Тады было прынята рашэнне аб фарміраванні і падрыхтоўцы да баявой працы жаночых авіяцыйных палкоў. Гэта было даручана Герою Савецкага Саюза Марыне Міхайлаўне Раскавай, якая ў 1938 годзе здзейсніла адважны пералёт па маршруце Масква — Кербі (у Хабараўскім краі) далёкасцю 6450 км без пасадак.

Фарміруюцца 586-ы знішчальны авіяполк, 587-ы бамбавальны авіяполк, 588 авіяполк. Раскава была прызначана камандзірам 587-га БАП. 22 лістапада 1942 года ён быў цалкам гатовы да баявых дзеянняў. І ўжо ў студзені 1943-га вылецеў пад Сталінград.

Гераічная біяграфія Марыны Раскавай скончылася трагічна. Пры пералёце па маршруце Арзамас — Саратаў, трапіўшы ў складаныя метэаўмовы, яна гіне. Пахавалі яе каля Крамлёўскай сцяны на Краснай плошчы.

У Віцебску, недалёка ад музея, і цяпер жыве дачка яшчэ адной гераіні вайны — Кацярыны Якаўлеўны Ацабрык. Гэтая жанчына служыла ў Чырвонай Арміі з 1942 года. У Вялікай Айчыннай удзельнічала са студзеня 1943 года на Данскім, Паўночна-Каўказскім, Заходнім, 3-м Беларускім, 1-м Прыбалтыйскім, 2-м Прыбалтыйскім і Ленінградскім франтах. Мела больш за пяцьдзясят паспяховых баявых вылетаў з баявым налётам больш за 85 гадзін.

У адным з вылетаў над Оршай бамбавік, у экіпажы якога была стралком-радыстам Ацабрык, падбілі. Дзяўчына ўратавалася на парашуце. Камандзір і штурман загінулі. Трыма ордэнамі і шматлікімі медалямі адзначаны воінскія заслугі Ацабрык. У студзені 1946 года Кацярына дэмабілізавалася з узброеных сіл, да 1949 года жыла з сям'ёй у Літве, затым па месцы службы мужа — у Слуцку. З 1956 года — у Віцебску. Працавала ў розных арганізацыях, у тым ліку на пасадзе старшага інжынера ў віцебскім інстытуце «Белжылпраект». Памерла ў 1991 годзе.

Сярод іншых вельмі цікава даведацца пра зямлячку віцяблян — Ніну Васілеўну Давыдзенку.

Яна ў 1940 годзе скончыла школу № 27. Паступіла ў маскоўскі інстытут інжынераў сувязі. На фронце з ліпеня 1941 года. Разам з іншымі студэнтамі працавала на ўзвядзенні абарончых пабудоў, была паранена. Пасля лячэння скончыла школу авіяцыйных спецыялістаў, вярнулася на фронт майстрам па ўзбраенні самалётаў. Падчас бамбёжкі аэрадрома іх знішчальнага авіяпалка атрымала пяць раненняў і моцныя апёкі. Вердыкт урачоў быў суровы: другая група інваліднасці. У сакавіку 1945 года вярнулася ў Віцебск. Яна стала паэткай, сур'ёзна і ўдумліва падышла да вывучэння творчай спадчыны любімых паэтаў, тэорыі вершаскладання. Але выйсці са сваімі вершамі да шырокай аўдыторыі доўга не рызыкавала. Яе літаратурны дэбют адбыўся на старонках абласной газеты «Віцебскі рабочы» ў 1979-м, напярэдадні Дня Перамогі. З таго часу яе творы неаднаразова публікаваліся на старонках абласнога і рэспубліканскага друку. Удзельнічала ў стварэнні калектыўнага зборніка «Дзвіна», выдала кнігу паэзіі «Як кранецца маёй рукі»...

А Марыя Іванаўна Доліна вядомая ўсім барысаўчанам дзякуючы цікаваму факту. З яе ўспамінаў: «Вымпел, скінуты вам, барысаўцам, гэта — калектыўнае прывітанне ўсяго лётнага складу 2-й эскадрыллі 125-га гвардзейскага авіяпалка. Тады эскадрылляй часова камандавала я, бо яе камандзір, гвардыі капітан Фамічова Клаўдзія Якаўлеўна, была збітая ў паветраным баі і знаходзілася ў шпіталі. У другі дзень, пасля таго як на дывізійным вечары, ва ўрачыстай абстаноўцы быў зачытаны загад аб прысваенні нашаму палку назвы «Барысаўскі», мы і напісалі жыхарам горада ліст з заклікам працаваць гэтак жа самааддана, як нашы лётчыцы ваявалі за вызваленне гэтага горада. 18 ліпеня 1944 года наш полк здзейсніў пералёт з Каменкі (адтуль мы ляцелі на вызваленне Барысава) на аэрадром Сітцэ-Вельск. Пралятаючы над Барысавам, я знізілася да 400 метраў і штурман скінула вымпел».

У маі 1940 года яна скончыла Херсонскую школу лётчыкаў Асаавіяхіма. У войску з чэрвеня 1941 года. За два месяцы баявых дзеянняў налятала 150 гадзін на самалёце У-2. У снежні 1941-га адкамандзіравана ў распараджэнне Героя Савецкага Саюза Раскавай. Са студзеня 1943 года па май 1945 года — камандзір звяна і намеснік камандзіра авіяэскадрыллі. 23 лютага 1945-га гвардыі капітану Долінай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Да 1949 года прадаўжала службу. Жыла ў Рызе, з 1983-га — у Кіеве. Памерла ў сакавіку 2010-га.

Кожная жанчына, пра якую можна даведацца на выставе, годная асобнага расповеду. Мішэль Кафо, палкоўнік легендарнага авіяпалка «Нармандыя — Нёман», пісаў: «Калі б сабраць кветкі ўсяго свету і пакласці іх да ног рускіх лётчыц, то і гэтым мы не змаглі б выказаць сваё захапленне імі».

Выстава будзе працаваць да жніўня.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**

# Імгненні пошуку

## У Магілёве праз арт-выставу ў вокнах бібліятэкі можна даведацца, як пошукавікі вяртаюць зніклых без вестак чырвонаармейцаў

Каб помнілі...

**Хто наогул гэтыя добраахвотнікі, якія ў вольны ад работы час садзяцца ў машыну і едуць на месцы былых баёў Вялікай Айчыннай вайны, угрызаюцца ў зямлю і прасейваюць яе скрозь пальцы ў пошуках запаветнага салдацкага медальёна? Пошукавікі часцей за ўсё расказваюць пра тых, каго яны вяртаюць, і вельмі рэдка пра сябе. Цяпер зроблена выключэнне. Музейныя вітрыны замянілі вокны магілёўскай Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя К. Маркса. На іх фотаздымкі з рабочымі момантамі найбольш буйных ваенных раскопак, прадметы, знойдзеныя ў стыхійных пахаваннях, — усё тое, з чым былі звязаны апошнія хвіліны жыцця невядомых герояў вайны. Пошукавікі прыўзнімаюць заслону і вяртаюць нас на амаль 80 гадоў таму, туды, адкуль не вярнуліся мільёны чырвонаармейцаў.**

На прэзентацыю выставы запрасілі будучых гісторыкаў, студэнтаў МДУ імя А. Куляшова і навучэнцаў магілёўскага сацыяльна-гуманітарнага каледжа. Ім сёння столькі ж, колькі было некаторым байцам клуба «Віккру», калі яны толькі пачыналі займацца гэтай справай. З 1994 года, дня заснавання клуба, у ім Мікалай Барысенка, Сяргей Бяспанскі, Ягор Шчанаў, Аляксей Міроненка, Андрэй Швайкоў. Сёння клуб аб'ядноўвае розных па ўзросце і прафесіі самаадданых пошуку людзей, якія ахвяруюць не толькі вольным часам, але і асабістымі грашыма. Бо дарога, амуніцыя, правіянт — усё за свой кошт. Але не займацца гэтай справай яны ўжо не могуць. Яна, як выказаўся Ягор Шчанаў, у крыві і менавіта дзякуючы ім на сённяшні дзень з зямлі паднятыя астанкі 1436 чырвонаармейцаў, па медальёнах, баявых узнагародах і асабістых рэчах устаноўлены імёны 91 героя, па архіўных звестках аднаўлены імёны 26,5 тысячы зніклых без вестак салдат і камандзіраў.

Па апошніх даных, за гады вайны загінула болей чым 27 мільёнаў савецкіх грамадзян, сотні тысяч чырвонаармейцаў зніклі без звестак. Родныя дагэтуль чакаюць іх з вайны, на адрас клуба прыходзяць лісты, дзе пошукавікам перадаюць словы падзякі за тое, што яны робяць дзеля памяці загінулых. Байцы клуба заўсёды працуюць на мяжы адкрыццяў. Акрамя імён, вер-

**Зараз вельмі не хапае масавага арганізаванага пошукавага руху.**

нутых з небыцця, гэта яшчэ і цалкам новыя звесткі пра Вялікую Айчынную вайну. Штогод па выніках пошукавых работ клубам рыхтуецца часопіс «Пошукавы веснік». Нядаўна пабачыла свет ужо чатырнаццатае выданне. На 300 старонках — напрацоўкі не толькі па раскопках, але і навукова-даследчыя артыкулы, усё, што датычыцца невядомых або малавядомых старонак ваеннай гісторыі Магілёўшчыны. Ёсць там і матэрыялы, якія друкаваліся на старонках «Звязды».



Клуб «Віккру» запрашае моладзь у сваё брацтва.

Удзельнікі клуба праводзяць велічэзную работу, але, на жаль, ахапіць усё не магчыма. Сёння ёсць патрэба ў энтузіястах.

— Яшчэ ў 90-я гады была магутная рэспубліканская арганізацыя «Пошук», у шэрагах якой працавалі тысячы людзей, — кажа **кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «Віккру», пісьменнік, гісторык Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Зараз грамадскі пошук практычна згорнуты. Асобныя пошукавыя групы ёсць у Мінскай, Гомельскай і Віцебскай абласцях. Як абласное масавае аб'яднанне засталіся толькі мы. У кожным раёне Магілёўскай вобласці ёсць нашы падраздзяленні або прадстаўнікі. Клуб аб'ядноўвае паўтары сотні чалавек, але гэтага недастаткова. Зараз вельмі не хапае масавага арганізаванага пошукавага руху.

Кіраўнік «Віккру» лічыць, што ў аснове патрыятычнага выхавання павінна быць менавіта пошукавая работа. Нельга зводзіць усё да прыбірання брацкіх пахаванняў, экскурсій, флэшмобаў, хоць гэта таксама важна.

— Пошук прыцягвае моладзь магчымасцю памацаць рукамі тое, што было 80 гадоў таму, — адзначае Мікалай Барысенка. — Нават гільза або фрагмент стралковага ўзбраення раскажуць больш, чым фільм або кніга.

Працаваць на раскопках школьнікам забаронена, але ўжо стала традыцыяй прывозіць іх на месцы правядзення пошукавых работ. Яны затрымліваюцца на зусім кароткі час, але і гэта важна. Бо нават калі з 30 чалавек загарыцца пошукам адзін, можна лічыць, што гэта робіца недарэмна. Сумесны праект з бібліятэкай — яшчэ адна спроба звярнуць увагу на важнасць пошукавай справы.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

**Анатоль РАЗАНОВІЧ**

# ПРАСВЯТЛЕННЕ

*Апавяданне*

КАМУ не марыцца пра лепшае... Праўда, часам нават і не падазраеш, што ў прыдатак да таго лепшага можа быць зусім нечаканы «паварот лёсу». Не ведаў пра тое і Рыгор Семянчук, які меў стары «масквіч», але даўно марыў пра сапраўдны еўрапейскі аўтамабіль, паўтараючы сабе і сябрам вядомы выраз авантурыста Астапа Бэндэра: «Аўтамабіль — не раскоша, а сродак перамяшчэння». І вось нарэшце — а было тое на пачатку 90-х, калі трохі прыадчынілася «жалезная заслона», — у Рыгора з'явіліся грошы, каб купіць недарагое замежнае аўто. Патэлефанаваў польскаму сябру Дарыюшу ў Любартуў, невялікае мястэчка па дарозе на Люблін. Павітаўшыся, адразу перайшоў да справы: папрасіў купіць яму машыну. Польскую, нямецкую, французскую альбо італьянскую. Карацей кажучы, любую, але зробленую ў Еўропе.

— Якую мадэль? — паспрабаваў дапытацца Дарыюш.

— Сам выберы, — паклаўся Рыгор на досвед і густ польскага сябра.

— Колькі маеш пянёндзаў? — пацікавіўся Дарыюш.

— Дзевяцьсот марак, — па даўняй звычцы прыцішыў голас Рыгор.

У трубцы павісла маўчанне. Дарыюш, мабыць, прыкідваў, што больш-менш вартае можна купіць за такія адносна невялікія грошы. Рыгор зразумеў і папярэдзіў:

— Больш грошай няма, так што машыну бяры надзейную, каб хоць два-тры гады паездзіць. А там паглядзім, што з ёй рабіць.

— Розуме, — буркнуў Дарыюш. — Кеды машына будзе ў мяне, то я зазвоню.

Праз тыдзень патэлефанаваў і сказаў толькі два словы:

— Купіў самаход...

Кінуўшы трубку, Рыгор сціснуў свае касцістыя кулакі, рэзка ўскінуў іх уверх і гучна ўсклікнуў:

— Ёсць!

З кухні выглянула жонка. У яе вялікіх карых вачах было здзіўленне:

— Ты чаго?

— Машыну Дарыюш нам купіў! — Рыгор паляпаў далонню ў свае шырокія грудзі.

— А якую? — паспрабавала ўдакладніць Святлана.

— Ды якая розніца?! — ускіпеў Рыгор. — Галоўнае — машына ў нас ужо ёсць. Машына!.. Сёння вечарам выязджаю.

Ён уявіў сябе за рулём іншамаркі — і добры настрой тут жа вярнуўся.

— Што, на ноч гледзячы? — занепакоілася жонка.

— Так, — Рыгор кіўнуў. — Каб раніцай быць там. Да Бяла-Падляскі паеду на цягніку, там — аўтобусам, і гадзін у восем-дзевяць буду ў Дарыюша.

Святлана ўрэшце ўсвядоміла важнасць падзеі: купля машыны. Абняла Рыгора і ласкава загаварыла:

— Цяпер мы зможам у любы час ездзіць у вёску да бацькоў, сваякоў ці з сябрамі на прыроду. Здорава!

— Здарова, — пагадзіўся Рыгор. — Але ж машына патрэбна не для таго, каб проста ездзіць. Яна павінна грошы зарабляць.

— У якім сэнсе?

— У прамым, — усміхнуўся Рыгор. — На машыне буду ў Польшчу ездзіць. Прычым не толькі тавар вазіць, каб прадаваць, але і людзей з сабой браць. Напрыклад, суседа Мікалая. Ён за тое плаціць будзе.

— Нядобра на суседзях нажывацца, — паківала галавой жонка.

— Нядобра без грошай быць, — прабурчаў Рыгор. — Ці мала што...

— А што?

— Ну, а раптам на лячэнне грошы спатрэбяцца?.. У нас у вёсцы, ты ж бачыш, пасля Чарнобыльскай катастрофы амаль кожны тыдзень хтосьці памірае. Гэта ў нас. А ў Брэсце, іншых гарадах? Мала пра тое пішуць-гавораць, але ж радыяцыя, нібы змяюка, паўсюль паўзе, кусае. Прыпаўзла — атрымлівай... Як задумаешся, то страшна.

— Ой, не кажы ты пра такое, — адмахнулася жонка. — Чаго бяду наклікаць? Што наканавана, кажуць, тое ні на якім кані не аб'едзеш. А ў нас во хутка дзіцятка будзе. Дай Бог, каб усё добра.

— Дай Бог... — уздыхнуў Рыгор. — Чацвёртая гадзіна ўжо, буду збірацца...

II

Любартаў сустрэў Рыгора цішынёй і марудлівым рухам гарадскіх аўтобусаў.

«То не Варшава...» — з ноткамі лёгкай іроніі падумаў Рыгор, сузіраючы местачковае жыццё.

Ужо не раз бываў ён у польскай сталіцы — па справах, як сам казаў. Прадаваў на цэнтральным стадыёне, пераабсталяваным пад рынак, цыгарэты, запалкі ды сухі спірт у таблетках. Гэтая штука, дарэчы, спірту ані грама не мае, толькі полымя, калі гарыць, на спіртавое падобнае. Зручна з сухім гаручым нават у воглым лесе вогнішча запаліць, дровы ў каміне, вугаль у мангале. Цыгарэты, запалкі прыносілі прыбытку яму ўдвая, а сухое гаручае давала навару яшчэ больш. Каб таблеткі разбіралі хутчэй, Рыгор запальваў адну на прылаўку, і гарэла яна да канца гандлёвага дня. Такая грубая, але «гарачая» рэклама заўсёды спрацоўвала. Эфект яе ўзрастаў, калі Рыгор падаграваў сабе банку тушонкі проста за прылаўкам: і гарыць, і грэе, і смачна пахне...

— Цо то ест? — дзівіліся патэнцыйныя пакупнікі.

Рыгор з выглядам знаўцы тлумачыў. І проста на вачах сухі спірт рос у цане, ішоў нарасхват.

Цяпер ён прыехаў у Польшчу не прадаваць — купляць, бо павінны ж нашы мары спраўджвацца.

— Чэсьць! — радасна і шчыра павітаў яго светлавалосы і кучаравы Дарыюш. Запрасіў госця ў свой асабняк. Гаварыў ён, як заўсёды, па-польску, перасыпаючы мову беларускімі ды рускімі слоўцамі.

— Не-е, у дом не пойдзем, — замахаў рукамі Рыгор, якому карцела ўбачыць машыну. — Ты прабач, але я ж не гасцяваць прыехаў.

— Як хцэш... — Дарыюш паказаў рукою на гараж. — Прошэ...

Перад Рыгорам паўстаў легкавік — двухдзвернае купэ з транзітнымі нумарамі. Рыгор углядаўся ў яго і не верыў: няўжо за 900 марак? Машына — светла-зялёны металік, бліскучыя дыскі, храмаваныя бамперы, на даху — люк, на вечку багажніка — чорны спойлер, які нібы падкрэслівае хуткасныя вартасці мадэлі. Адным словам, сіла.

— Я такіх яшчэ не бачыў... — выдыхнуў нарэшце ўзрушаны Рыгор.

— То праўда? — не паверыў Дарыюш.

— Так, — пацвердзіў Рыгор. — А што за мадэль?

— «БМВ», трэцяя мадэль, — без усялякіх эмоцый кінуў Дарыюш. — Немцы выпускаюць. Шыбка едзе. Паспробуеш?

— Давай! — загарэўся Рыгор.

Селі ў машыну, прычынілі дзверцы. І падалося Рыгору, што ён у нейкім лятальным апараце. Для чалавека сціплага і простага ў побыце, з вясковым радаводам такое адчуванне было натуральным. «БМВ», нягледзячы на ўзрост, сваю марку трымаў годна: шум з вуліцы ў машыну не трапляў, рухавік не роў, як у Рыгоравым «масквічы» ці «Волзе», а нібы муркатаў — вельмі ціха. У прыгожым, амаль раскошным салоне плыла лёгкая музыка, на шчытку прыбораў — з устаўкамі з натуральнага дрэва — свяцілася ўсё. Да таго ж па нагах і вакол усяго цела разлівалася дзівосная прахалода.

— Куды ехаць? — Рыгор адчуваў, як рукі яго і ўсё цела злёгку прабівае дрыжыкамі. — За горад?

— Так, на дрогу до Любліна. — Дарыюш накінуў на сябе аўтамабільны рамень. — З повротэм.

Рыгор, кранаючы з месца, рэзка — так атрымалася з непрывычкі — зняў нагу з педалі счаплення і паддаў газу. Машына, пракручваючы заднімі коламі, ірванулася ўперад.

— Увага! — спалохана ўскрыкнуў Дарыюш. — Цо ты робіш?..

Рыгор прамаўчаў ды ўжо без рыўкоў павёў «БМВ» па вуліцы, а потым па трасе на Люблін. Машына паводзіла сябе паслухмяна, ды энергічнасць з яе аж праменіла. І як толькі Рыгор дадаваў газу, «БМВ», нібы неаб'езджаны жарабец, гатовы быў, здавалася, прыпадняцца на дыбкі, несціся туды, куды скіруе рух гаспадар. Аж хацелася Рыгору закрычаць ад унутранай радасці, што перапаўняла грудзі, ад палёту душы, ад здзяйснення даўняй «ружовай» мары пад назвай «Іншамарка».

Стрымліваючы свае пачуцці ды эмоцыі, Рыгор за пару кіламетраў да Любліна разважліва, без рэзкіх рухаў развярнуўся ды пагнаў машыну ў Любартуў. Цяпер яму хацелася ўжо як мага хутчэй вярнуцца ў Брэст, дзе чакалі яго маладая жонка ды сябры.

— Гербата, кава, вудка? — усміхнуўся Дарыюш, калі прыехалі да яго на двор.

— Не, дзякую! — адмовіўся Рыгор. Дастаў грошы, аддаў сябру. — Дзякуй табе... Дзенькую!.. Прыязджай да мяне. Я і мая жонка будзем цябе чакаць.

— Пшыеду, — паабяцаў Дарыюш.

На развітанне ён патлумачыў, што калі на ноч пакідаць «БМВ» у двары ці ставіць на незнаёмай стаянцы, то лепш вымаць аўтамагнітолу з панэлі: хаваць у багажнік альбо забіраць з сабой.

— Для чаго гэта? — здзівіўся Рыгор.

— Без радыё самаход працаваць ня бэндзе: такая канструкцыя, — патлумачыў Дарыюш. — До побачэння!

Пацiснуўшы адзін аднаму рукі, мужчыны абняліся. Гэта быў знак павагі, удзячнасці, простага чалавечага жадання сустракацца зноў і зноў. Хоць на польскай зямлі, хоць на беларускай.

III

Каб скараціць шлях да Брэста, Рыгор за Любартовам звярнуў з асноўнай трасы на мястэчка Парчаў — прасёлкавую дарогу. Яна была звілістай, вузкай, бегла праз палі, лясы, хмызнякі. Ды машына і па такой дарозе ішла настолькі лёгка, плаўна, што Рыгору захацелася спаць. І ён, з недасыпам, амаль задрамаў, калі яго «БМВ» рэзка стаў абганяць легкавы «фіят». Адлегласць паміж аўто ўсё звужалася, вось-вось бакі машын сутыкнуцца. «Бандыты», — імгненна зразумеў Рыгор. Ён з абурэннем і страхам кінуў позірк у салон чужой машыны. Згледзеў чатырох маладых хлопцаў у скуранках. Той, што сядзеў справа ад кіроўцы, прыадчыніў фортку, закрычаў:

— Курвэ, затшымайсь!

Адчуўшы небяспеку, Рыгор дадаў хуткасці, панёсся ў бок мяжы, спадзеючыся там знайсці абарону — ці то ў жыхароў Парчава, ці то ў паліцыі... Усё роўна ў каго, але толькі наперад!

Кіламетраў дзесяць «БМВ» і «фіят» ішлі амаль упрытык: як у чарзе на мяжы ці ў гарадскім заторы. Тры ці чатыры разы па заднім бамперы «БМВ» біў «фіят» сваім перадком. Абодва самаходы ўздрыгвалі, а з імі нервова тузаліся і людзі.

— Затшымайсь! — крычаў той жа хлопец, калі правае крыло «фіята» на пару імгненняў раўнялася з левым крылом «БМВ». — Заб'ю!..

Відаць было, бандзюга не жартаваў: у руках яго Рыгор убачыў пісталет. Час ад часу ён ляцеў пасярэдзіне дарогі: каб не мог абагнаць «фіят». Але сустрэчныя машыны прымушалі «БМВ» зноў ціснуцца да правага боку, каб не сутыкнуцца.

«Што рабіць?» — у галаве Рыгора шалёна калацілася адзінае пытанне. Ён ужо разумеў, бачыў: гоніцца за ім кодла бандытаў, каб пачысціць яго кішэні ці забраць і машыну. Такіх выпадкаў, ведаў, на польскіх дарогах шмат. Сярод бандытаў былі як палякі, так і беларусы, рускія, украінцы — злачынны інтэрнацыянал з былога Саюза і краін Варшаўскага дагавора. Розныя прайдзісветы, аслепленыя прагай лёгкай нажывы, бязбожна рабавалі людзей, не зважаючы на іх узрост, пол ці нешта іншае.

— Затшымайсь!..

Рыгор пачуў глухі стрэл — і тут жа востры боль працяў патыліцу, а праз імгненне бакавым зрокам ён згледзеў, як асыпалася шкло ў правых дзвярах. Скасавурыўся ды ўбачыў, што і задняя шыбка разбітая. Значыць, куля прайшла па крывой навылет, не закрануўшы яго, а ў патыліцу дзюбнуў кавалачак з задняга шкла. Рыгор машынальна правёў далонню па ране, адчуў мокрасць: кроў.

«Хоць бы якую вену не кранула, — пранеслася ў галаве. — Бо крывёй сыду...»

Глянуў на «ганчакоў». Яны, пэўна ж, вырашылі-такі вырвацца ўперад, перагарадзіць дарогу. І тут быццам нешта ўнутры ў Рыгора спрацавала, і страх у ім нечакана знік. З'явілася такая злосць, што, здавалася, дай ёй волю, і яна, як лавіна, знясе-перакуліць бандыцкую машыну, запоўніць дарогу і ўвесь свет.

— С-сукі!.. — завыў Рыгор і аж у падлогу ўціснуў педаль газу.

Вузкая дарога — не надта паляціш. Ды дзе там разважаць! Любой цаной адарвацца б ад зграі. Заехаць у любое мястэчка і нарэшце спыніцца.

Рыгор, амаль уціснуўшы руль у грудзі, пагнаў, не разбіраючы дарогі: роўны асфальт, старая брукаванка, ямы... «Хутчэй, хутчэй!» — загадваў ён сам сабе ды прышпоранаму на поўную моц самаходу.

І «фіят» пачаў адставаць.

«Дагналі?!.» — хваля шалёнай радасці аж калыхнула Рыгора.

Ён прыўзняў галаву, дзіка засмяяўся. І тым, відаць, парушыў нейкі нябачны баланс, тузануў неасцярожна за танюсенькую нітачку, што трымае кожнага з нас ад нараджэння. У той жа момант правыя колы самахода скаціліся з асфальту на ўзбочыну, пайшлі віляць па пяску. Руль біла так, нібы ён жывы ды трасецца ў ліхаманцы. Рыгор ад нечаканасці рэзка ўзяў налева — і ўраз машына пайшла юзам, яго ўжо не слухалася. Крутнуў назад. «БМВ» завыў і правым бокам слізгануў па прыдарожнай траве. Яшчэ праз імгненне машына вылецела на абочыну і на ўсёй хуткасці прайшлася правым бокам па прысадзістай сасне, здзіраючы з яе галіны ды кару.

«Канец!» — мільганула ў галаве.

Магчыма, ён паспяшаўся так падумаць ды пры тым з усёй сілы, нібы ставячы кропку, націснуць на тормаз. І «БМВ» як звар'яцеў. Заднія колы машыны, адарваўшыся ад зямлі, прыўзняліся, перадок яе заскрыгатаў, і па лесе рванай хваляй пакаціўся рэзкі гук: нібы перадсмяротны ўздых дзікай істоты з фантастычнага кіно...

Калі Рыгор прыйшоў у сябе, то пабачыў нейкіх людзей. Яны выцягвалі яго з машыны... Паклалі пры дарозе... Колькі ён там праляжаў?.. Свядомасць вярнулася ў Парчаўскай лякарні толькі на наступны дзень. Аніколькі не здзівіўшыся, нібы так і павінна быць, Рыгор доўга пазіраў спачатку ў светлае акно, потым павярнуў галаву — і ўбачыў жонку. Быццам у нейкім дрыготкім святле, якое раптам пралілося і ў яго душу — аж унутры пацяплела. Прыціснуўшы рукі да грудзей, Святлана стаяла побач і плакала.

«Ты чаго?» — хацеў запытаць ён, але не спытаў, бо язык быў такі сухі, што і варочацца не хацеў. Паспрабаваў усміхнуцца, і тое ўдалося. Размазваючы слёзы па твары адной рукой, прытрымліваючы асцярожна жывот другою, Святлана прыпала да яго твара, прашаптала:

— Ты жывы...

— Машына... — выціснуў Рыгор.

— Ды купім яшчэ, купім табе машыну... — шчаслівая паабяцала жонка.

— Добра, — ледзь чутна, хрыплавата ды няўпэўнена прашаптаў Рыгор — і сам падзівіўся свайму новаму голасу.

**Пераклаў з рускай мовы**
**Іван ЖДАНОВІЧ.**




## ЯЕ ЗВАЛІ ЛАСТАЎКАЙ...
### як каханую жонку

Здарылася гэта недзе ў першай палове сямідзясятых — даўно, тады, калі купля машыны была для чалавека (а тым больш для вяскоўца) нечым з разраду фантастыкі... І не толькі з-за цэн. Грошай, задаўшыся мэтай, яшчэ можа было наскрэбці ды напазычаць. А вось дабро на пакупку амаль не прадавалася... Яно давалася, але гады ў рады, па разнарадцы выканкамаў, і яго яшчэ трэба было заслужыць. Чым? Гераічным мінулым (тады ветэранаў вайны яшчэ шмат жыло), поспехамі ў рабоце, актыўнасцю ў грамадскім жыцці і г. д.

Віталік нічым такім як быццам не вылучаўся. Працаваў трактарыстам у мясцовым калгасе, па сумяшчальніцтве развозіў па вёсках балоны з газам, на гармоніку добра граў і раптам...

Вушам не паверыў! Не ведаў, бедны, куды яму кінуцца, што рабіць?! Такое шчасце раптам падвaліла, гэтакі шанц, каб змяніць жыццё...

Але ж і грошы проста шалёныя.

Тэрмінова пачаўся іх збор: маці Віталіка аддала яму ці не ўсе свае «пахавальныя» — вырашыла, што нельга ёй пакуль паміраць. Стосік яшчэ тых, савецкіх, дваццаціпяцірублёвак любімаму зяцю ахвяравала цешча. Дапамаглі рублём сёстры-браты, сябры, нават знаёмыя. І цялушку прадаць пашчасціла (трохгадовага пародзістага быка старшыня гаспадаркі ўгаварыў пакінуць для асемянення калгаснага статка, штучнае тады толькі пачыналася)...

Факт, што грошы, прычым немалыя, былі сабраныя, і Віталік такі падагнаў да хаты белага «Жыгулька» пятай мадэлі.

У вёсцы той дзень можна было аб'явіць выхадным ці нават святам. «Пяцёрка» мігам апынулася ў густаватым натоўпе: многім хацелася паглядзець ці нават пагладзіць «бландзінку» (гаспадар уважліва сачыў, каб акуратна, каб, крый бог, не падрапалі). Жонка з цешчай накрывалі сталы.

Віншаванні там чаргаваліся з тостамі-анекдотамі, гамонка была вясёлая, аж пакуль адзін з гасцей не зірнуў у акно, не застыў з паднесенай да вуснаў чаркай, не прамовіў кароткае:

— Віталь, там бык.

Гэтага было дастаткова. Усе бяседнікі (і гаспадар найперш) кінуліся на двор.

Убачанае там было не для слабых. Бык, якога звычайна трымалі ў загарадцы, неяк вырабіўся і цяпер спакойна чухаў свой рог аб дзверцы новага «Жыгулька»... Часаў старанна і, мусіць, даўно, бо ў «пяцёркі» быў добра пакамечаны бок, праз фарбу ў асобных месцах праступала першароднае жалеза...

У Віталя ад такога нахабства адвісла сківіца, але ніводнага слова ён вымавіць не мог. Добра, сусед не разгубіўся: закрычаў, разоў колькі агрэў быка свайм кульбай ды пагнаў у хлеў.

...Думаеце, Віталь засмуціўся, стаў сварыцца на сваіх дамашніх ці рваць на сабе валасы? Не, нават не падумаў: «нямая сцэна» скончылася тым, што ён нырнуў у хату, схапіў гармонік,разам з гасцямі праспяваў сваю любімую песню, пасля чаго ўсе зноў вярнуліся за сталы. Абмывалі «Жыгулька» ды яго першыя «раны» аж да самага вечара.

А раніцой мясцовыя ўмельцы з калгаснай майстэрні ўжо стараліся — вярталі «бландзінцы» ранейшы выгляд, пасля чаго Віталь стаў любіць яе яшчэ больш і зваць амаль як жонку — Ластаўка.

**Мікола Жукоўскі,**
*Аршанскі раён.*

## ЗА ШТО «ЗМАГАЛІСЯ»...

У адной вёсцы жыў дзядзька Радзівон. Яму жарт састроіць, што плюнуць, і пра гэта ведалі ўсе, але ж...

Спяшаецца ён неяк да кума на свежыну, сустракае па дарозе хлапцоў. Тыя папрасілі закурыць, прыпыніліся ды кажуць:

— Дзядзька, а збрашы нам што-небудзь, пакуль падымім!

— Я і рады б, — адказвае той, — але ж часу няма. Вада каля млына грэблю прарвала, людзі кашамі рыбу носяць... Я сабе ўжо багата набраў, да кума іду, каб паведаміць.

Сказаў так і ледзь не падбегам далей. Хлопцы, нядоўга думаючы, таксама — толькі ў бок млына.

Прыйшлі, бачаць, што ўсё спакойна там: грэбля цэлая, мука ў млыне мелецца...

— Ну дзядзька, ну хітрун: як не збрэша, то не ступіць! — чухае патыліцу адзін з хлапцоў.

Другі ў адказ:

— Дык мы ж самі яго прасілі...

Можа, так хітруны і нараджаюцца?

**Міхась Сліва,**
*г. Рагачоў.*

## АДСТУПАЦЬ МАРЦІН НЕ ЎМЕЎ

Не ведаю, як там у вялікіх гарадах, а ў нас, у вёсцы, па вечарах ды святах жанчыны любяць пасядзець на лавачках, абмеркаваць нейкія навіны, пагаварыць пра паводзіны людзей і хатніх гадаванцаў.

На жаль, няшмат іх цяпер і ў асноўным дробныя (каты, сабачкі, курачкі, козы), але ж у гаспадарцы ёсць, а значыць, ёсць і тэмы для размоў. «Чалавек мой днямі ў хату ўлятае, — расказвала цётка Васіліна, — і крычыць: «Падай сякеру! Засяку гада!.. Бач, што надумаўся — біцца стаў! Галоўнае, ззаду падкраўся і ў нагу мне — дзюбай... Ажно кроў пайшла! Здурнеў наш певень!» Я ў адказ: «Чыё б мычала?.. Ты ўспомні, хто першы пачаў? Думаеш, я не бачыла: з хаты выходзіш, — куры да цябе... А ты што? Крычыш на іх, праганяеш, ледзь не футболіш... І хочаш, каб пасля гэтага пявун цярпеў, каб не хацеў адпомсціць? Мяне ж, дзякуй богу, не чапае. Ты не думаў, чаму?»

Вось такая ў суседзяў была размова. І, падобна, не марная, бо певень на тым падворку па-ранейшаму спявае. Значыць, жывы.

Кот мой, дарэчы, таксама, хоць прыбіць яго і хацелася: варты быў. Але ж па парадку.

...Аднойчы дзеці прывезлі мне маладога сіямца, сказалі: «Мама, гэта Марцін. Можна, ён у вас пажыве? Паглядзі, які прыгажунчык!»

Паглядзела — і сапраўды цікавае стварэнне: сам рыжы-рыжы, а вочы вялізныя, сінія...

Што ж, думаю, няхай жыве: мышэй лавіць наўрад ці будзе, але і шкодзіць, можа, таксама.

Ага: як той казаў, чакай Пятра... Кот чым больш таўсцеў на свежым малацэ, тым больш сваволіў.

Неяк, напрыклад, схаваўся ў летняй кухні. У нас там звычайна лішні посуд стаіць: розныя міскі, слоікі, вёдры, каструлі...

У той дзень — пасля вялікіх гасцей — яшчэ і горы талерак. Помню, перамыла іх, на стол саставіла. Туды ж на прасушку маслабойку паклала (ручную, драўляную і, як на ліха, пасярэдзіне). Пайшла ў хату нешта рабіць, а кот — ну не інакш — масла захацеў? Вырашыў праверыць, ці не засталося яго ў бойцы. Туды залез, а вось назад...

Ну не ўмеў наш Марцін адступаць! І развярнуцца, вядома ж, не мог, хоць, як відаць, і спрабаваў: раскочваў бойку па стале, ад чаго спачатку на падлозе апынуліся трохлітровыя слоікі, потым талеркі, а нарэшце і сама тая пасудзіна — разам з катом...

Факт, што хапіў ён ліха!

Не менш яго перапала і мне, калі адчыніла дзверы ў кухню і яе ж не пазнала. Там нібы Мамай прайшоў: усё было раскідана, разбіта...

Кот выжыў. Пра яго (і не толькі) у нашай вёсцы кажуць, што каб не любіў, — забіў бы! А любіш і ўсё даруеш. Ці не так?

**Наталля Лойка,**
*Чэрвеньскі раён.*

## ЛІК НІЧЫЙНЫ — АДЗІН : АДЗІН

Гэту гісторыю любіў расказваць мой тата. Ён у сваіх бацькоў быў першынцам, пасля яго ў маёй бабулі з дзядулем нарадзілася яшчэ шэсць дзяўчынак і адзін хлапчук.

Па сённяшнім часе — вялікая сям'я, па тым — відаць, звычайная. Ва ўсякім разе, як тата казаў, у халодныя дні ім усім хапала месца на печы, у цёплыя — рыбы ў рэчцы і грыбоў ды ягад у лесе.

Праўда, неяк адну з сястрычак звабілі суседскія вішні. Ды так, што яна, малая (гадкоў пяць ці было) не пабаялася — залезла на дрэва!

Як адтуль не зваліліся і колькі тых ягад з'ела, не ведае ніхто. А вось што потым было — ці не ўся акруга.

У суседа, гаспадара тых вішань, быў амаль дарослы сын. Выйшаў ён з хаты, згледзеў на дрэве дзіця і (хапіла ж розуму!) вырашыў... напужаць. А для гэтага падкраўся пад вішню, задраў галаву і знізу як гаркне!..

Ачомацца не паспеў, — нешта за каўнер пацякло... Мякка кажучы, непрыемнае...

Потым дайшло, што дзіця з таго перапуду не стрымалася...

Карацей, выйшла «нічыя»: тая дзяўчынка аніколі больш не лазіла да суседзяў у вішні, а той суседскі дзяцюк дзясятаму заказаў палохаць малых.

**Валянціна Гудачкова,**
*г. Жыткавічы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

# Няхай і далей беражэ і радуе нас «Берагіня»

**Сёлетні год для акцыябрскай «Берагіні», якая мае адзінаццаты парадкавы нумар, асаблівы. Найперш тым, што адзін з яе ўдзельнікаў адзначае 25-гадовы юбілей. Я маю на ўвазе заслужаны аматарскі мастацкі калектыў «Берагіня» з вёскі Мётча Барысаўскага раёна. Стварыў і нязменна кіруе ім, як і адборам, і заключным этапам усяго фестывалю, таксама сёлетні юбіляр Мікола Аляксеевіч Козенка. Юбілей сёлета і ў нязменнай нядаўняй клапатлівіцы аб годным правядзенні заключных мерапрыемстваў рэспубліканскага фестывалю «Берагіня» ў Акцябрскім Святланы Анатолеўны Беразоўскай.**

Дзякаваць Богу, у сённяшняй беларускай культуры маецца нямала знакавых падзей, якія набылі сваю заслужана багатую і цікавую гісторыю, сталі пазнавальнымі прыкметамі нашай краіны. Справядліва і заслужана. Але нават сярод іх я выдзеліў бы адну, найбольш пазнавальную і карысную. Карысную як для дня сённяшнага, так і для нашага культурнага заўтра. Для будучыні таму, што яна, гэтая падзея, адрасавана і моладзі, нават самаму юнаму пакаленню беларусаў. Яна абуджае ў іх тыя нязводныя пачуцці і памкненні, якія даюць пэўную і моцную надзею: не, не здрабнее беларуская культура, не вычарпаецца, не перасохне яе крынічная бруістасць, калі так настойліва і пастаянна будуць далучацца ўсё новыя і новыя прыхільнікі.

Вядома ж, я маю на ўвазе непаўторную, надзвычай цікавую і захапляльную для мяне асабіста «Берагіню». Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва — так гэтае свята называецца афіцыйна. І што для мяне асабліва важна — тут кожнае слова на сваім месцы, са сваім невычэрпным зместам. Выкінь хоць адно, і сэнс мерапрыемства — не надта справядлівае слова ў дачыненні да «Берагіні» — будзе няпоўны, неадэкватны, нясутнасны. Але я дадаў бы да гэтых азначэнняў і яшчэ адно — міжнародны, бо гэта таксама праўдзівая праўда.

Давайце зразумеем, што рэспубліканскі азначае яго высокі і паўнацэнны статус, які забяспечваецца шырокім удзелам многіх і многіх прыхільнікаў харэаграфічнага мастацтва, як навічкоў, так і традыцыйных носьбітаў.

Давайце ўсвядомім, што фестываль спалучае ў сабе і шматфарбнасць на месцах, падчас адбору на рэспубліканскі ўзровень, і надзвычайную захопленасць, і майстэрства на заключным этапе. Фестываль — гэта ж вам не шараговае свята, а калі свята — то і адносіны да яго ўзвышаныя і святочныя.

Ну, а ў фальклорнай напоўненасці акурат тая адметнасць, якая акрамя ўсяго сведчыць і аб пераемнасці, вабнасці і неўміручасці традыцый, таго, што нязводна жыло і жыве ў людскім хаўрусе. Фальклорная скіраванасць далучае фестываль да незабыўных акцый, якія аберагаюць і прымнажаюць тыя даўнія традыцыі, з якімі вырасла не адно пакаленне творча адораных і проста неабыякавых беларусаў.

Тое ж самае можа даказаць і яшчэ адно слова з гэтай кагорты — мастацтва. Так, высокае і блізкае нам мастацтва, якое годна і ахвотна пераймае маладое пакаленне.

Усё гэта разам сведчыць: «Берагіня» жыла, жыве і, спадзяюся, будзе жыць. Як я казаў не раз, «Берагіня» не загіне, калі да яе захаваюцца паважлівыя і неабыякавыя, не дзяжурныя адносіны ва ўсіх зацікаўленых: ад арганізатараў да ўдзельнікаў. І тыя і тыя хочуць, могуць і ўмеюць зрабіць «Берагіню» сапраўдным святам фальклорнага мастацтва, харэаграфічнага майстэрства. Дзякуй усім за такі шчыры і патрэбны нам клопат.

Вядома ж, асаблівая мая падзяка нязменнаму матору і ўмельцу, няўрымсліваму шукальніку і творцу Міколу Аляксеевічу Козенку. Гэта яго непасрэдная заслуга, праявa яго дараваітасці і неабыякавасці, што фестываль так доўга жыве і паўтараецца ўжо не ў адным маладым пакаленні.

Не магу таксама не згадаць і не аддаць належнае яшчэ аднаму зацікаўленаму і неабыякаваму да «Берагіні» чалавеку, намаганнямі якога фестываль у Акцябрскім стаў такім, якім стаў. Я маю на ўвазе нястомную і творча апантаную Святлану Анатолеўну Беразоўскую. Яна годна дапаўняла такую ж нястомнасць і апантанасць Міколы Аляксеевіча. Дзякуючы ім фестываль стаў і рэспубліканскім, і фальклорным, і мастацкім. І яшчэ — змястоўным, захапляльным, патрэбным. Міжнародным таксама, бо ў ім не раз бралі ўдзел замежныя майстры харэаграфічнага мастацтва.

Калі згадзіцца, што Козенка навучае традыцыйнаму побытаваму танцу як дарослых, так і дзяцей, то Беразоўская годна спрыяла рэальнай праяве гэтага майстэрства падчас заключнай часткі фестывалю, які многія гады ўпрыгожвае багатую на свае традыцыі Рудабелку — зямлю Акцябрскага раёна. І няспынна, нястомна распаўсюджваецца па блізкіх і далёкіх ад яго мясцінах — вельмі хацелася б, каб ні на крапельку не змізарнелі і не зменшыліся гэтыя абсягі.

Гэтаксама, як свае падыходы да такой акцыі своеасаблівым чынам правярае і даказвае іх карысць Мікола Аляксеевіч з родным яму гуртом «Берагіня» з вёскі Мётча Барысаўскага раёна. Дарэчы, сёлета надзвычай значная падзея ў жыцці не толькі гэтага калектыву — 25-гадовы юбілей мётчынскай «Берагіні». Заслуга і дасягненне — без перабольшання — Міколы Козенкі. І нездарма яму сёлета ўручылі высокія ўзнагароды не толькі Беларускі фонд культуры, сябрам рады якога ён з'яўляецца, але і многія іншыя ўстановы. За свае 70 гадоў Мікалай Аляксеевіч заслужыў не толькі гэтыя адзнакі. Дарэчы, гэтаксама і юбілейная сёлета Святлана Анатолеўна Беразоўская. І вельмі добра, што ўсё навідавоку, што многія і многія гэта бачаць і цэняць, дзякуюць і падтрымліваюць.

Адно хацелася б пажадаць — каб гэтая падтрымка не знікала і не меншала, што дадавала б да апантанасці Козенкі і неабыякавасці Беразоўскай яшчэ больш карысных і шчырых памкненняў. Бо здаўна вядома: калі мы разам, калі сумесна, то на многае здольныя. А яшчэ ўявіце, якая гэта карысная і практычная школа выхавання моладзі. Таму маё моцнае спадзеўнае жаданне, каб такая ж берагіня альбо берагінька — хоць бы адна — была ў кожным раёне нашай Беларусі. Вось гэта было б самае рэальнае, самае праўдзівае захаванне нашых адметных нацыянальных харэаграфічных традыцый, бо аднаўляць страчанае значна цяжэй, чым захоўваць і зберагаць тое, што жыве.

